Нацыянальны інстытут адукацыі

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

І. М. ГОЎЗІЧ
І. Л. ШАЎЛЯКОВА-БАРЗЕНКА

# ШУКАЕМ ШЭДЭЎРЫ!..

(Вопыты літаратурных даследаванняў)

11 КЛАС

Дапаможнік для вучняў

ISBN 978-985-6941-82-8

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**І. М. ГОЎЗІЧ,**
**І. Л. ШАЎЛЯКОВА-БАРЗЕНКА**

# ШУКАЕМ ШЭДЭЎРЫ!..
# (Вопыты літаратурных даследаванняў)

**11 клас**

***Дапаможнік для вучняў***
***агульнаадукацыйных установаў***
***з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Г74

*Серыя заснавана ў 2010 г.*

**Гоўзіч, І. М.**

Г74 Шукаем шэдэўры!.. : (вопыты літаратурных даследаванняў) : 11-ы кл. : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / І. М. Гоўзіч, І. Л. Шаўлякова-Барзенка. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 120 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).
ISBN 978-985-6941-82-8.

**УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)**
**ББК 83.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-6941-82-8**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

# ШЭДЭЎРЫ ЧАКАЮЦЬ…
# або ДЫЯЛОГ з «ВЯЛІКАЙ» НАВУКАЙ

Сусветна вядомы французскі пісьменнік Анатоль Франс меркаваў, што кожны крытык павінен «вяршыць шэсце паміж шэдэўрамі». Мы прапануем Вам, шаноўныя адзінаццацікласнікі, не проста прымерыць на сябе «лаўры» крытыка і павандраваць па лабірынтах мастацтва слова. На факультатыўных занятках «Шукаем шэдэўры!.. (Вопыты літаратурных даследаванняў)» Вы маеце шанец адчуць сябе сапраўдным даследчыкам літаратуры і нават яе стваральнікам — стаць аўтарам навукова-даследчага ці мастацкага тэкстаў.

Як вучні выпускнога класа Вы ўжо маеце даволі поўнае ўяўленне пра асаблівасці станаўлення і развіцця беларускай літаратуры (да сярэдзіны XX стагоддзя); у IX—X класах адбывалася таксама знаёмства і з асобнымі творамі сусветнага мастацтва слова. Акрамя таго, за час вывучэння беларускай і рускай літаратур Вы назапасілі веды па тэорыі і гісторыі літаратуры, неабходныя не толькі для аналізу літаратурных тэкстаў на ўроках, але і для самастойнага спасціжэння і асэнсавання твораў розных відаў мастацтва.

Разам з тым, любы чалавек, які хоча адчуць сябе не «трэскай» на хвалях жыцця, але сапраўдным стваральнікам свету наўкола сябе, не можа абмежавацца тымі ведамі, тым вопытам спасціжэння рэчаіснасці, які яму прапануюць у «гатовым выглядзе» іншыя людзі (настаўнікі, бацькі, равеснікі). Таму, з аднаго боку, гэтыя факультатыўныя заняткі па беларускай літаратуры павінны дапамагчы Вам абагуліць і сістэматызаваць раней набытыя веды па літаратуры, замацаваць і паглыбіць уменні працаваць з мастацкімі, літаратурна-крытычнымі, літаратуразнаўчымі і іншымі тэкстамі. Падчас работы

на факультатыўных занятках Вы пашырыце свае веды пра класіку сучаснай беларускай літаратуры і пазнаёміцеся з героямі найноўшага прыгожага пісьменства, якое ствараецца на Вашых вачах (нават калі Вы пакуль гэтага не заўважалі). У Вас будзе шанец суаднесці ўласныя ацэнкі літаратурных твораў і з’яў з меркаваннямі крытыкаў, літаратуразнаўцаў, саміх пісьменнікаў, узбагаціць свой літаратурны і агульнакультурны кругагляд.

З другога боку, дзякуючы гэтым факультатыўным заняткам Вы атрымаеце магчымасць грунтоўна пазнаёміцца з асноўнымі метадамі навуковага пазнання, з разнастайнымі прыёмамі самастойнага спасціжэння як прыгожага пісьменства, так і іншых відаў мастацтва. Вы здолееце самастойна (хоць і з дапамогай настаўніка) вызначаць мэту і кірунак уласнага літаратурна-даследчага пошуку, выбіраць насамрэч цікавую для Вас праблему даследавання, планаваць яго вынікі, належным чынам прадстаўляць плён сваёй творчай працы. Словам, у Вас будзе рэальная магчымасць уключыцца ў дыялог з «вялікай» навукай — літаратуразнаўствам, культуралогіяй, мастацтвазнаўствам, эстэтыкай і інш.

Аднак мы прапануем Вам не толькі авалодаць майстэрствам напісання рэферата і даклада, не толькі адчуць сябе навукоўцамі, прадставіць грамадскасці (няхай пакуль толькі школьнай) свае знаходкі і адкрыцці. Разам са сваімі сябрамі Вы можаце стаць аўтарам і адначасова складальнікам ды рэдактарам зборніка навукова-даследчых работ «Алхімія слова — XXI». Магчыма, больш прывабнай Вам падасца праца па складанні анталогіі з паэтычных твораў ужо вядомых пісьменнікаў і сённяшніх маладых паэтаў (ці нават уласных вершаў) альбо стварэнне біябібліяграфічнага даведніка «XX+I», прысвечанага найбольш выбітным беларускім празаікам, паэтам, драматургам, крытыкам мяжы XX—XXI стагоддзяў. Пры жаданні можна заняцца стварэннем цыклаў аўдыё- альбо відэагутарак пра разнастайныя з’явы і праблемы мастацтва слова з пісьменнікамі, журналістамі, краязнаўцамі, юнымі творцамі — Вашымі равеснікамі, літаратарамі, музыкантамі, мастакамі. Вы маеце рэальную магчымасць стаць заснавальнікам «Музея сучаснасці» — стварыць рэальную ці віртуальную экспазіцыі, прысвечаныя літаратурным суполкам, ру-

хам, таварыствам, якія ўдзельнічаюць у літаратурным жыцці Беларусі 1990—2000-х гадоў. Альбо можна паспрабаваць сябе ў ролі галерыста — заняцца арганізацыяй у межах праекта «Літ-галерэя» мультымедыйных выставаў, прысвечаных творчасці пісьменнікаў-землякоў. Нарэшце, калі Вам падаецца, што сусвет гатовы да сустрэчы з адшуканымі асабіста Вамі шэдэўрамі, прапануем папрацаваць над канцэпцыяй і зместам сайта (напрыклад, www.litara&art.by), прысвечанага найноўшай беларускай літаратуры — творчасці сённяшніх паэтаў, празаікаў, драматургаў, крытыкаў. Урэшце, Вы — бясстрашны паляўнічы за шэдэўрамі — самі можаце стаць не толькі аўтарам сайта, але і яго «персанажам».

Мы спадзяемся, што арганізаваная ў межах факультатыўных заняткаў «Шукаем шэдэўры!..» даследчая дзейнасць па літаратуры дапаможа вучням выпускнога класа падрыхтавацца да будучай вучобы ў сярэдніх прафесійных ці вышэйшых навучальных установах (нават калі Ваш выбар не будзе звязаны з філалогіяй). Даследчая работа па літаратуры дае каштоўны вопыт самастойнай працы з тэкстам, узбагачае чытацкі вопыт; яна дапаможа актывізаваць і рэалізаваць Ваш творчы патэнцыял, сцвердзіць сябе не толькі як аўтара паўнавартаснага навуковага даследавання, але і як сапраўднага сааўтара сённяшняй літаратуры і культуры ўвогуле.

***З пажаданнямі творчага плёну,***
***аўтары***

# УВОДЗІНЫ
## *(Карысная інфармацыя для ўсіх паляўнічых за шэдэўрамі, вопытных і... амаль вопытных)*

Як вядома, права быць самастойным (у самым шырокім сэнсе) нельга атрымаць у падарунак: так ці інакш, чалавек вымушаны яго здабываць. У пэўным сэнсе, навучанне ў школе і ёсць шлях да самастойнасці, адным са складнікаў якой, дарэчы, з’яўляецца здольнасць самастойна спасцігаць свет і самастойна асэнсоўваць яго разнастайныя праявы.

Рухаючыся ад першага класа да адзінаццатага, вучань павінен авалодваць асноўнымі навыкамі самастойнай працы, да якіх адносяцца:

— самастойны пошук інфармацыі;

— ацэнка і адбор патрэбных крыніц (у тым ліку дакументаў);

— аналіз і вылучэнне галоўнага ў крыніцы інфармацыі;

— валоданне пісьменным выкладам матэрыялу;

— правільнае афармленне спісу выкарыстанай літаратуры.

І менавіта гэтыя навыкі спатрэбяцца Вам, вучням выпускнога класа, для напісання тэзісаў, канспектаў, рэфератаў, дакладаў, для стварэння праекта (ці праектаў), прычым не толькі падчас працы на факультатыўных занятках «Шукаем шэдэўры!..», але і ў недалёкім самастойным (амаль дарослым) студэнцкім жыцці. Прычым важна з самага пачатку зразумець, што галоўнай *мэтай* гэтых факультатыўных заняткаў становіцца не само па сабе выштукоўванне (складанне) тых ці іншых тэкстаў, але абагульненне і ўпарадкаванне, сістэматызацыя набытых Вамі ведаў па літаратуры, замацаванне і развіццё ўменняў працаваць з мастацкімі, літаратурна-кры-

тычнымі, літаратуразнаўчымі крыніцамі, знаёмства з разнастайнымі прыёмамі самастойнага спасціжэння мастацтва слова. Зрэшты, і гэтыя мэты падпарадкаваны адной, самай галоўнай: даць Вам магчымасць разгледзець і рэалізаваць у сабе творцу, няхай пакуль і праз вопыты літаратурных даследаванняў.

Напачатку варта скласці агульнае ўяўленне пра тое, у чым заключаецца сутнасць навуковых даследаванняў.

**Навукова-даследчая работа** — гэта сістэма метадаў, сродкаў і арганізацыйных мерапрыемстваў, якія забяспечваюць засваенне розных этапаў навукова-даследчага цыкла, які ўключае фундаментальныя (навуковыя) даследаванні, праектныя работы. У дачыненні да школьнага навучання, пад «навукова-даследчай работай» маецца на ўвазе самастойная творчая работа вучня, выкананая пад кіраўніцтвам настаўніка. Яна ўключае ў сябе складанне абгрунтаванага плана дзеянняў, які ўдакладняецца на працягу ўсяго перыяду выканання работы; адпаведна, вынікі гэтай работы фіксуюцца ў выглядзе рэфератаў, дакладаў, праектаў.

**Віды навукова-даследчай дзейнасці** вучняў па літаратуры можна прадставіць у выглядзе наступнай схемы:

**навукова-даследчая дзейнасць**

**інфармацыйна-рэфератыўная**
кароткі выклад якога-небудзь пытання, зместу кнігі, артыкула ў выглядзе рэфератаў пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, гісторыю напісання твораў і г. д.

**праблемна-рэфератыўная**
не толькі даецца кароткая навуковая інфармацыя, але і аналізуюцца аспекты праблемы ў выглядзе дакладаў пра спецыфіку стылю пісьменнікаў, месца іх творчасці ў гісторыка-літаратурным працэсе і г. д.

**даследчая**
самастойна даследуецца пэўная праблема

Асноўнымі **вучэбна-лагічнымі ўменнямі,** неабходнымі для паспяховага авалодання навукова-даследчай дзейнасцю, з’яўляюцца наступныя (прадставім іх таксама ў выглядзе схемы):




Прапануем Вам пазнаёміцца з іх вызначэннямі.

**Абагульненне** — лагічная аперацыя, у выніку якой пасля выключэння відавой прыкметы атрымліваецца паняцце, шырэйшае па аб’ёме, але меншае па змесце. Абагульненне — гэта лагічнае вылучэнне пэўных уласцівасцей, якія належаць класу прадметаў, і фармуляванне такой высновы, якая распаўсюджваецца на кожны асобны прадмет дадзенага класа.

**Азначэнне** — абагульненая фармулёўка, якая раскрывае, тлумачыць змест, сэнс чаго-небудзь.

**Аналіз** (ад старажытнагрэч. «раздзяленне») — аперацыя ўяўнага або рэальнага падзелу цэлага (рэчы, уласцівасці, працэсу, з’явы) на элементы, складнікі, якая выконваецца ў працэсе пазнання або прадметна-практычнай дзейнасці чалавека. У дапаўненне да сінтэзу, метад аналізу дазваляе атрымаць інфармацыю аб структуры аб’екта даследавання.

**Доказ** — гэта лагічная аперацыя абгрунтавання праўдзівасці сцвярджэнняў з дапамогай фактаў і іншых праўдзівых

меркаванняў. Доказнасць і абгрунтаванасць — важныя якасці даследавання.

**Паняцце** — форма мыслення, якая адлюстроўвае прадметы ў іх агульных істотных прыкметах.

**Параўнанне** — працэс колькаснага або якаснага супастаўлення розных уласцівасцей (падабенстваў, адрозненняў, пераваг, недахопаў і інш.) двух аб’ектаў.

**Праблема** — палажэнне, умова, пытанне, аб’ект, які стварае нявызначанасць, нявырашанасць, цяжкасць. Праблемай называецца пытанне, якое не мае адназначнага рашэння. Нявызначанасцю праблема адрозніваецца ад задачы.

**Сінтэз** (ад грэч. «сумяшчэнне», «з’яднанне») — мэтанакіраваны працэс злучэння або аб’яднання розных рэчаў або паняццяў у нешта якасна новае, цэлае.

**Метад** (ад грэч. «шлях даследавання», «тэорыя», «вучэнне») — спосаб дасягнення мэты, сукупнасць прыёмаў практычнага і тэарэтычнага асваення (пазнання) рэчаіснасці.

**Навуковы метад** — сукупнасць асноўных спосабаў атрымання новых ведаў і метадаў рашэння задач у рамках любой навукі.

Існуюць наступныя **метады агульнанавуковага даследавання** (звярніце ўвагу на схему):



Раскрыем сутнасць метадаў агульнанавуковага даследавання і звязаных з імі паняццяў.

**Абагульненне** — пераход ад часткі да агульнага, абстрактнае выдзяленне пэўных уласцівасцей, якія адносяцца да групы прадметаў, і фармуляванне пэўнай высновы, якая распаўсюджваецца на кожны прадмет групы.

**Аналогія** (ад старажытнагрэч. «адпаведнасць», «падабенства») — падабенства паміж прадметамі, з'явамі ў пэўных адносінах. Прыём разважання, доказу; форма вывадаў, якая дазваляе гаварыць пра падабенства паміж прадметамі, іх уласцівасцямі і якасцямі.

**Асацыяцыя** — сувязь паміж асобнымі ўяўленнямі, калі адно з іх выклікае другое.

**Аргумент** — факт, які прыводзіцца для пацвярджэння чаго-небудзь; часам аргументам называюць увесь доказ цалкам.

**Доказ** — довад або факт, які служыць падставай для пэўнага сцвярджэння; спосаб абгрунтавання верагоднасці выказвання, меркавання, тэорыі з дапамогай лагічных вывадаў і практычных сродкаў (назіранне, эксперымент).

**Дэдукцыя** (ад лац. «вывядзенне») — спосаб разважання ад агульных палажэнняў да прыватных (ці іншых агульных) вывадаў; пры пабудове публічнай прамовы па дэдуктыўным узоры спачатку фармулюецца яе тэзіс, які потым даказваецца.

**Індукцыя** (ад лац. «навядзенне») — спосаб разважання, пры якім агульныя вывады робяцца на аснове асобных, прыватных фактаў.

**Назіраннем** называецца мэтанакіравана арганізаванае і зафіксаванае ўспрыманне аб'екта.

**Падлік** — статыстычны метад даследавання, пры якім фіксуюцца колькасныя або якасныя паказчыкі аб'екта.

**Параўнанне** — працэс колькаснага або якаснага супастаўлення розных уласцівасцей двух аб'ектаў, з дапамогай якога выяўляюцца якасныя і колькасныя характарыстыкі прадметаў.

**Прыклад** — канкрэтны факт, які выкарыстоўваецца для тлумачэння, доказу чаго-небудзь.

**Прычына** — з'ява, якая выклікае, абумоўлівае ўзнікненне другой з'явы. Прычын можа ўказвацца некалькі.

**Разважанне** будуецца на лагічных доказах. Слушнасць разважання даказваецца ці адмаўляецца з дапамогай аргументаў.

**Тэзіс** — сцвярджэнне, якое патрабуе абгрунтавання; коратка сфармуляванае палажэнне, што перадае адну з асноўных думак падрыхтаванага паведамлення.

**Эксперымент** (ад лац. «спроба», «вопыт») — дзеянні і назіранні, якія выконваюцца для праверкі (праўдзівасці або памылковасці) гіпотэзы навуковага даследавання. Любы эксперымент прадугледжвае наступныя этапы: 1) збор інфармацыі; 2) назіранне; 3) аналіз; 4) выпрацоўка гіпотэзы; 5) распрацоўка тэорыі, якая тлумачыць гіпотэзу; 6) праверка тэорыі на практыцы; 7) фармуляванне высноў.

Акрамя агульнанавуковых метадаў даследавання існуюць і метады літаратуразнаўства.

Адзін з першых навуковых метадаў вывучэння літаратуры — ***біяграфічны метад***. Ён быў прапанаваны і распрацаваны ў эпоху рамантызму французскім паэтам, крытыкам Шарлем Агюстэнам дэ Сент-Бёвам. Вызначальныя моманты ў біяграфічным метадзе — *біяграфія* і *асоба* пісьменніка.

Паходжанне назвы яшчэ аднаго метаду літаратуразнаўства (і цэлай навуковай дысцыпліны) звязана з іменем антычнага бога гандлю Гермеса: паводле старажытнагрэчаскай міфалогіі, ён перадаваў пасланні алімпійскіх багоў людзям і павінен быў тлумачыць сэнс гэтых пасланняў. Першапачаткова ***герменеўтыка*** (ад старажытнагрэч. «мастацтва тлумачэння») суадносілася з тлумачэннем прадбачанняў аракула. Пазней інтэрпрэтацыя і крытыка былі звязаны з тлумачэннем твораў Гамера, іншых паэтаў. Александрыйская філалогія займалася збіраннем літаратурных помнікаў і іх апісаннем. Біблейская герменеўтыка канцэнтравалася на разуменні і вытлумачэнні тэкстаў Святога Пісання.

У сучасным літаратуразнаўстве герменеўтыка атрымала надзвычай шырокае распаўсюджанне: з ёй звязана асэнсаванне асноўных метадалагічных прынцыпаў, на якіх грунтуецца ўся найноўшая тэорыя літаратуры.

***Культурна-гістарычны метад*** — спосаб вывучэння літаратуры, распрацаваны ў другой палове XIX стагоддзя французскім філосафам, крытыкам, гісторыкам літаратуры,

пісьменнікам Іпалітам Адольфам Тэнам. Галоўнае ў метадзе — сувязь мастацкага твора з гістарычнай рэальнасцю, яе ўплыў на ўспрыманне твора чытачом.

***Псіхалагічны метад*** спрыяе спасціжэнню тайны мастацкага твора з апорай на псіхалогію творцы і чытацкае ўспрыманне. Атрымаў шырокае развіццё ў апошняй трэці XIX стагоддзя і на працягу ўсяго XX стагоддзя. Асноўнае ў метадзе — арыентацыя на вывучэнне ўспрымання мастацкага твора чытачом, які спасцігаецца ў залежнасці ад уласнага душэўнага складу і жыццёвага вопыту.

***Параўнальны (кампаратывісцкі) метад*** — адзін з галоўных навуковых метадаў, калі шляхам параўнання аднаўляецца агульнае і асаблівае ў з'явах, у заканамернасцях іх развіцця. Шырока выкарыстоўваецца ў гуманітарных навуках (моваунаўстве, гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыцы і інш.). Кампаратывістыка даследуе механізм узнікнення паэтычных формул, супастаўленняў, сімвалаў, матываў, вывучае з'явы мастацтва слова шляхам супастаўлення іх з іншымі падобнымі з'явамі пераважна ў розных нацыянальных літаратурах.

***Сацыялагічны метад*** звязаны з разуменнем літаратуры як адной з форм грамадскай свядомасці. Даследчыкі робяць акцэнт на сувязь літаратуры з сацыяльнымі з'явамі пэўных эпох.

***Структурны метад*** — вывучэнне структуры твора: сукупнасці ўстойлівых адносін, якія забяспечваюць захаванне асноўных уласцівасцей аб'екта.

***Фармальны метад*** — кірунак у тэорыі літаратуры XX стагоддзя. Адзін з тэарэтыкаў фармальнага метаду В. Шклоўскі адзначаў, што літаратурны твор уяўляе сабой «чыстую форму». Пры вывучэнні твораў падобным метадам увага засяроджваецца на форме, а не на змесце; тлумачыць тэкст — значыць, аналізаваць, з чаго ён створаны.

## Пытанні і заданні

1. У чым заключаецца сутнасць навукова-даследчай дзейнасці, якія яе віды Вы ведаеце?

2. Ахарактарызуйце (на выбар) некалькі відаў вучэбна-лагічных уменняў. Паспрабуйце прывесці прыклады на кожны з іх.

3. Якія віды навукова-даследчых метадаў Вы ведаеце? У чым заключаецца адрозненне індукцыі і дэдукцыі? Які метад выкарыстоўваў Шэрлак Холмс? Падмацуйце свой адказ прыкладам.

4. Прачытайце некалькі прапанаваных настаўнікам літаратуразнаўчых (крытычных) артыкулаў. Якія літаратуразнаўчыя метады даследавання выкарыстоўваюцца ў іх? Свае разважанні падмацуйце канкрэтнымі прыкладамі.

5. Адкажыце на пытанні анкеты:

• *Прозвішча, імя, імя па бацьку; клас; узрост.*

• *У якой галіне Вы лічыце магчымым прымяніць свае сілы (навука, мастацтва, прамысловасць, спорт, будаўніцтва, транспарт, адукацыя і інш.)?*

• *Якая прафесія Вам падабаецца і чаму?*

• *Якая справа атрымліваецца ў Вас лепш за ўсё?*

• *Якая праца прыносіць Вам задавальненне, асалоду?*

• *Які вучэбны прадмет з'яўляецца ў Вас любімым, чаму?*

• *Вам уласцівыя (падкрэсліце тое, што падыходзіць менавіта для Вас):*

*добрая памяць; назіральнасць; кемлівасць; дакладнасць рухаў; тонкае абаянне; добры слых; уменне адрозніваць колеры і іх адценні; лагічнасць; цікавасць да навук; працаздольнасць; любоў да тэхнікі; уменне мадэліраваць; цікавасць да эксперыментаў; любоў да дзяцей; жаданне падарожнічаць; любоў да прыроды; цікавасць да кулінарыі; задавальненне ад зносін.*

• *Вашы патрабаванні да будучай прафесіі (пранумаруйце найбольш значныя для Вас пазіцыі; дапішыце патрабаванні, якіх няма ў пераліку):*

*канкрэтныя вынікі; магчымасць творчасці; развіццё здольнасцей; высокая зарплата; зносіны з цікавымі людзьмі; грамадская значнасць; гібкі графік,* ______________________
______________________________________.

• *Чым Вы займаецеся ў вольны час?*

• *Вы наведвалі тэатр за апошнія тры месяцы?*

• *Вы купілі кнігу за апошні месяц? Якую?*

• *Вы маеце доступ у інтэрнэт? Як часта Вы ім карыстаецеся?*

• *Якія газеты і часопісы Вы чытаеце?*

• *Якая з крыніц інфармацыі з'яўляецца для Вас асноўнай?*

• *Колькі кніг Вы прачыталі за апошні месяц?*

• *Якія Вашы крытэрыі выбару кніг?*

• *Назавіце Вашага любімага пісьменніка (пісьменнікаў).*

• *Назавіце Ваш любімы твор (творы)?*

• *Працягніце фразу: «Я люблю (не люблю) чытаць кнігі таму, што...»*

• *Ці можна ў XXI стагоддзі абысціся без кніг (аргументуйце свой адказ)?*

6. Складзіце (індывідуальна або ў групах) анкету для выяўлення чытацкіх інтарэсаў аднакласнікаў (сяброў, бацькоў). Правядзіце анкетаванне. Падрыхтуйце высновы.

# ЭТАПЫ ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Напісанне любой навукова-даследчай работы ўключае наступныя этапы: **дыягнастычны** (выбар тэмы; вызначэнне мэт і задач; аб'екта і прадмета даследавання), **прагнастычны** (фармулёўка праблемы, гіпотэзы даследавання), **арганізацыйны** (збор інфармацыі, складанне бібліяграфіі; запіс, перапрацоўка і сістэматызацыя матэрыялу; напісанне плана (тэзісаў) работы; напісанне навукова-даследчай работы; падрыхтоўка вывадаў і абагульненняў; рэдагаванне тэксту, прагназаванне найбольш верагодных пытанняў і адказаў на іх; публічнае выступленне).

Умоўна пералічаныя этапы можна аб'яднаць у два вялікія перыяды даследавання.

## І Падрыхтоўчая работа

**1. Папярэдняя падрыхтоўка**, што выяўляецца ва ўдакладненні *тэмы* і *назвы* рэферата, якая павінна быць кароткай і выразнай. Навукова-даследчыя работы пішуцца па найбольш актуальных тэмах *(«Сучасная беларуская ўрбаністычная паэзія: жанравая палітра, лірычны герой», «Традыцыі класічнай літаратуры і наватарства ў паэзіі Алеся Разанава», «Філасофска-інтэлектуальная плынь у сучаснай беларускай паэзіі», «Вобраз Чарнобыля ў беларускай паэзіі другой паловы 1980—1990-х гадоў» і інш.).* У іх на аснове аналізу і абагульнення навуковага матэрыялу супастаўляюцца розныя погляды аўтараў і вызначаецца ўласная пазіцыя даследчыка з выкладам адпаведных аргументаў. Тэмы даследчых работ павінны ахопліваць і дыскусійныя пытанні літаратурнага жыцця, адлюстроўваць перадавыя навуковыя

ідэі, абагульняць тэндэнцыі ў літаратурным працэсе з улікам актуальнага вопыту сучаснага літаратуразнаўства.

Пасля гэтага неабходна сфармуляваць *мэту* (асноўны напрамак даследчыцкай дзейнасці, навошта праводзіцца даследаванне), *задачы* (канкрэтызацыя мэты), *аб'ект* (працэс ці з'ява, з якой звязана праблемная сітуацыя, матэрыял, на якім праводзіцца даследаванне — зборнікі, творы і г. д.) і *прадмет* (тое, што знаходзіцца ў рамках аб'екта, аспект праблемы, пры даследаванні якога цалкам пазнаецца аб'ект, яго галоўныя рысы, часцей за ўсё супадае з вызначэннем тэмы ці блізкі да яе) даследавання.

**2. Бібліяграфічная праца** — работа з даведачнымі выданнямі, бібліяграфічнымі паказальнікамі і даведнікамі, энцыклапедыямі, прагляд газет, часопісаў і іншых прац, вывучэнне навуковых і літаратурных крыніц, рэкамендаваных настаўнікам і самастойна падабраных у выніку вывучэння бібліяграфіі ў бібліятэцы. Асабліва ўважліва трэба сачыць за новай літаратурай па абранай тэме, у тым ліку за артыкуламі ў часопісах «Роднае слова», «Беларуская мова і літаратура», «Полымя», «Маладосць» і інш., у тыднёвіку «Літаратура і мастацтва». У працэсе вывучэння літаратуры рэкамендуецца рабіць выпісы, паступова аб'ядноўваючы і назапашваючы тэарэтычны і практычны матэрыял. Для атрымання патрэбнай літаратуры Вы павінны прайсці некалькі шляхоў: праглядзець адпаведны раздзел каталога бібліятэкі або электронны каталог і адабраць кнігі па тэме.

Нярэдка кніг па тэме бывае недастаткова, таму даводзіцца адшукваць артыкулы ў перыядычных выданнях. У чытальнай зале перыядычных выданняў Вы можаце прагледзець часопісы за апошнія некалькі гадоў ці дванаццатыя (апошнія) нумары часопісаў, у якіх размяшчаецца поўны пералік артыкулаў, надрукаваных у часопісе за год. Пажадана, каб кнігі і артыкулы, адабраныя Вамі, былі выдадзены нядаўна, утрымлівалі найбольш «свежую» інфармацыю па тэме.

**3. Першасная праца з кнігамі, часопісамі, газетнымі артыкуламі і іншым інфармацыйным матэрыялам** заключаецца не толькі ў праглядзе назваў, зместу, уступных раздзелаў, заключэнняў і высноў прац, а таксама табліц, схем і малюнкаў. Сюды ўваходзіць рэгістрацыя і адбор літарату-

ры, неабходнай для напісання работы. Існуе карткавы і сшыткавы спосабы рэгістрацыі і адбору літаратуры для напісання рэферата. Больш мэтазгодным з'яўляецца карткавы спосаб — карткі пры неабходнасці можна сістэматызаваць, што і робіцца пры напісанні даследчай работы.

**4. Падрабязнае і выбарачнае чытанне, вывучэнне літаратуры і яе апрацоўка, занатоўванне**. Для напісання навукова-даследчай работы ўжываецца чатыры віды запісаў: цытата, анатацыя, тэзісы, канспект.

***Цытата*** — даслоўная вытрымка з тэксту, выказванне аўтара, якое прыводзіцца для пацвярджэння ўласных думак і меркаванняў. Пасля цытаты (ці пад ёй) абавязкова ўказваецца прозвішча аўтара.

***Анатацыя*** — кароткая перадача сутнасці, зместу работы з абавязковай характарыстыкай яе скіраванасці, значнасці, прызначэння (кароткае заключэнне і вывады работы).

***Тэзісы*** — асноўныя палажэнні і думкі работы.

***Канспект*** — кароткі або падрабязны перапрацаваны аўтарам пісьмовы выклад зместу крыніцы. Трэба адзначыць, што напісанне аб'ёмнага і падрабязнага канспекту патрабуе здольнасці да творчай дзейнасці. У падрабязным канспекце даводзіцца рабіць адпаведныя тлумачэнні, прыводзіць прыклады, складаць план і сцісла адказваць на пытанні плана словамі з тэксту.

**5. Заключная праца падрыхтоўчага перыяду** зводзіцца галоўным чынам да напісання плана навукова-даследчай работы ў адпаведнасці з падабраным і вывучаным матэрыялам.

План — схематычна запісаная сукупнасць коратка сфармуляваных думак-загалоўкаў, «шкілет» работы. Форма запісу ў выглядзе плана вельмі важная для арганізацыі працы над даследаваннем. Па форме планы бываюць *простыя* і *складаныя*. Складаныя планы маюць падпункты, якія дэталізуюць ці тлумачаць змест асноўных загалоўкаў.

**Асаблівасці плана:**

1. Сцісласць, выразнасць. Менавіта дзякуючы гэтай асаблівасці план лёгка ўдасканальваць як па змесце, так і па форме.

2. Нагляднасць і лагічнасць — адлюстраванне паслядоўнасці выкладу матэрыялу.

3. План спрыяе абагульненню зместу — дасканалы план раскрывае змест работы.

Фармуляванне пунктаў плана — складаны працэс, які патрабуе ўдумлівасці, дакладнасці, вобразнасці і адначасова лагічнасці мыслення. У якасці загалоўкаў пунктаў плана могуць выступаць асноўныя думкі або тэмы.

## II Праца над тэкстам і афармленнем работы

**1. Напісанне і афармленне тытульнага ліста**, на якім абавязкова пішацца тэма, а таксама назва ўстановы адукацыі, год напісання, прозвішча аўтара і кіраўніка і (пры неабходнасці) іншыя дадзеныя.

**2. Напісанне Асноўнай часткі, Уступу і Заключэння** (падрыхтоўка вывадаў, абагульненняў і высноў).

**3. Рэдагаванне** гатовага тэксту, пры якім трэба імкнуцца, каб кожны абзац утрымліваў самастойную думку або палажэнне. Па першай фразе абзаца ўжо павінна быць зразумела, аб чым далей пойдзе размова.

Можна кіравацца наступнымі пытаннямі падчас рэдагавання тэксту:

1. Ці дакладна сфармулявана тэма, мэта, задачы, аб’ект і прадмет даследавання?
2. Ці лагічная структура работы?
3. Наколькі дарэчнае ўжыванне прыкладаў, доказаў, фактаў, лічбаў, цытат.
4. Ці вытрымана стылявое адзінства даследавання?
5. Наколькі вывады адпавядаюць задачам даследавання.
6. Ці сустракаюцца ў тэксце памылкі і апіскі?

**4. Прагназаванне пытанняў,** якія могуць узнікнуць падчас ці пасля вуснага выступлення (абароны праекта), і **адказаў** на іх.

**5. Публічнае выступленне**. Змест (тэзісы) навукова-даследчай работы апрабіруецца на семінары, навуковай канферэнцыі. Папярэдне падрыхтаваўшы тэзісы, на працягу 7—10 хвілін аўтар выказвае асноўныя палажэнні работы. Пасля даклада аўтар адказвае на пытанні, затым могуць выступаць

апаненты, якія папярэдне пазнаёміліся з тэкстам, адзначаць моцныя і слабыя бакі работы.

Наступная схема адлюстроўвае 3 фазы падрыхтоўкі даследавання:

**дакамунікатыўная камунікатыўная посткамунікатыўная**




## Правілы публічнага выступлення:

1. Вусны даклад павінен быць падрыхтаваны і папярэдне прадуманы.

2. Толькі вельмі дасведчаны чалавек можа дазволіць сабе імправізаваную прамову.

3. Калі Вы абмежаваны рэгламентам, скараціце змест Вашага даклада: лепш сказаць мала, чым сказаць дрэнна.

4. У кожнай прамове павінны быць пачатак, сярэдзіна і фінал; пры гэтым фінал прамовы мае выключна важнае значэнне.

5. Складзіце план прамовы, асабліва, калі Вы абмежаваны рэгламентам. У плане ўтрымліваюцца асноўныя пункты выказвання, інфармацыя, якая патрабуе дакладнасці: даты, статыстычныя дадзеныя, цытаты (якія павінны быць кароткімі і суправаджацца выхаднымі дадзенымі крыніц), складаныя або малазнаёмыя словы і тэрміны (якія не рэкамендуецца ўжываць без патрэбы) і г. д.

6. План выступлення размяшчаецца на адным баку паперы; яго не варта пісаць на некалькіх лістах.

7. Вы павінны быць фізічна сабранымі, бадзёрымі, аптымістычнымі, спакойнымі, упэўненымі ў сабе; мець прывабны выгляд.

8. Многія моцна хвалююцца перад публічным выступленнем. Хваляванне натуральнае і карыснае: калі прамоўца не хвалюецца, значыць, ён не зацікаўлены ва ўласным поспеху і абыякавы да аўдыторыі.

9. Занадта моцнае хваляванне шкоднае. Каб пазбавіцца ад яго, пастарайцеся непасрэдна перад выступленнем падумаць аб чым-небудзь добрым.

10. Калі прыйдзе час выступаць, упэўнена падыдзіце да месца, з якога Вы павінны гаварыць.

11. Жэстыкуляцыя павінна быць умеранай: трымайце рукі вольна, не махайце імі, але і не выцягвайце «па швах». Прамоўніцкі жэст адпавядае тэмпу і зместу прамовы, ён павінен быць плаўным і ўпэўненым, але не занадта шырокім.

12. Рэгулюйце гучнасць голасу ў залежнасці ад аб’ёму памяшкання і велічыні аўдыторыі. Не спрабуйце перакрычаць аўдыторыю.

13. Гук скіроўвайце не ўніз і не ўверх, а прама перад сабой — над галовамі слухачоў.

14. Стаўшы перад аўдыторыяй, усміхніцеся і паглядзіце на людзей, якія Вас будуць слухаць.

15. Зрабіце невялікую пачатковую паўзу. Калі шумна, павялічце паўзу больш і акіньце позіркам аўдыторыю.

16. Плаўна ўступайце ў прамову. Не пачынайце занадта энергічна, інакш Вам не хопіць сіл завяршыць прамову, а слухачам — вытрываць яе да канца.

17. Памятайце, што Вы звяртаецеся да людзей, якія пагадзіліся выслухаць Вас, а не да паперкі, на якой напісаны Ваш даклад.

18. Гаварыце спакойна і ўпэўнена, і Вас будуць слухаць.

19. Гаварыце гучна, выразна, захоўваючы мерны тэмп (100—200 слоў у хвіліну). Не спрабуйце змясціць максімум інфармацыі ў мінімум часу.

20. Падчас выступлення глядзіце на аўдыторыю, паслядоўна фіксуючы позіркам групы людзей. Не звяртайцеся ўвесь час да аднаго і таго ж. Кожны павінен быць перакана违аны, што Вы звяртаецеся асабіста да яго.

21. У выступленні дакладчык, які з'яўляецца цэнтрам увагі, мацнейшы за аўдыторыю, якая заўсёды разрозненая.

22. Не бойцеся вялікіх аўдыторый, але бойцеся малых. Чым большая аўдыторыя слухачоў, тым лягчэй яе пераканаць.

23. Не гаварыце лішняга: думайце, што сказаць, але ніколі не гаварыце ўсё, што думаеце.

24. Выкарыстоўвайце толькі літаратурныя словы і выразы.

25. Не паўтарайце двойчы адно і тое ж слова.

26. Прамаўляйце не словамі, а фразамі. Фразы павінны быць звязанымі. Завяршайце кожную пачатую фразу. Даўжыня фраз вызначаецца станам і памерам аўдыторыі, аб'ёмам памяшкання, у якім Вы гаворыце. Чым большыя аўдыторыя і аб'ём памяшкання, тым меншай павінна быць сярэдняя даўжыня Вашай фразы.

27. Прамова — гэта чаргаванне слоў і паўз. Паўза вылучае найбольш значныя словы і фармулёўкі.

28. Інтанацыя павінна быць натуральнай і ўмеранай.

29. Кантралюйце рэакцыю аўдыторыі, фіксуйце групы людзей згодных і нязгодных з Вамі, уважлівых і безуважных, зацікаўленых і абыякавых, добразычлівых і негатыўна настроеных.

30. Калі ў аўдыторыі пачаўся шум, не павышайце, а паніжайце голас або зрабіце паўзу і ўважліва паглядзіце на аўдыторыю.

31. Не бойцеся рэплік з залы. Рэагуйце або не рэагуйце на іх па абставінах і з улікам Вашых інтарэсаў. Не давайце ўцягнуць сябе ў дыскусію: Вы павінны сказаць усё, што хацелі.

32. Адказы на пытанні і рэплікі павінны быць слушнымі, зразумелымі і кароткімі, альбо іх не павінна быць зусім.

33. Заключэнне павінна быць энергічным і аптымістычным. Пакажыце ўздымам голасу і інтанацыяй, што Вы сказалі ўсё патрэбнае, і не забудзьце падзякаваць аўдыторыі за ўвагу.

34. Выхад прамоўцы з трыбуны не павінен нагадваць уцёкі.

## Пытанні і заданні

1. Пералічыце асноўныя этапы даследчай дзейнасці. У чым заключаецца сутнасць кожнага з іх?
2. Складзіце алгарытм падрыхтоўкі і напісання навукова-даследчай работы.
3. Наладзьце разам з настаўнікам творчую сустрэчу (майстар-клас, «круглы стол») з крытыкамі, літаратуразнаўцамі, спецыялістамі ў галіне літаратурнага краязнаўства. Сфармулюйце яе тэму.
4. Падрыхтуйце анкету (сістэму пытанняў) для літаратуразнаўца (крытыка, краязнаўца).
5. У адпаведнасці з прыведзеным планам прааналізуйце публічнае выступленне (удзельнікаў арганізаванай у Вашай школе творчай сустрэчы альбо тэлеперадачы, якую раіў Вам праглядзець настаўнік, аднакласнікі ці інш.).

### План аналізу публічнага выступлення:

1. Ці ўдалымі былі пачатак і завяршэнне выступлення?
2. Наколькі цікавымі былі прыклады?
3. Ці адэкватныя гучнасць і тэмп маўлення?
4. Ці ўдала выбраў прамоўца стыль выступлення і адпаведныя моўныя сродкі?
5. Ці не заўважылі Вы парушэнняў лагічных і літаратурных норм у час выступлення?
6. Ці ўклаўся аратар у адведзены яму час?
7. Ці добра трымаўся перад аўдыторыяй?
8. Ці было цікава яго слухаць?
9. Ці вылучалася выступленне арыгінальнасцю? Калі так, то ў чым яна выяўлялася?

## ТЭМА, МЭТЫ, ЗАДАЧЫ, ПРАДМЕТ І АБ’ЕКТ ДАСЛЕДАВАННЯ

Калі Вы приступаеце да працы над навукова-даследчай работай, неабходна выразна ўяўляць сабе, пра што Вы будзеце пісаць. Гэта значыць, найперш трэба вызначыць сутнасць тэмы даследавання.

Пад **тэмай** разумеецца тое галоўнае, аб чым гаворыцца ў тэксце; акрамя таго, гэта і матэрыял, адабраны і арганізаваны ў адпаведнасці з задачамі даследавання і адлюстраваны ў вызначаным ракурсе. Тэма павінна быць ясная і зразумелая. Калі ж адразу сфармуляваць яе такім чынам не атрымліваецца, неабходна папрацаваць з даведачнымі выданнямі (энцыклапедыямі, слоўнікамі, даведнікамі), дзе даюцца кароткія звесткі па розных галінах ведаў, ці з вучэбнай і крытычнай літаратурай па прадмеце.

Паводле зместавага напаўнення і мэты тэмы бываюць:

— **інфармацыйна-рэфератыўныя** — яны маюць на ўвазе знаёмства з новай інфармацыяй («Гісторыя стварэння пенталогіі Івана Шамякіна “Трывожнае шчасце”», «Узыходжанне: асноўныя этапы творчай біяграфіі Васіля Быкава»);

— **праблемна-рэфератыўныя** — не толькі знаёмяць з новымі звесткамі, але і дазваляюць даследчыку праявіць самастойнасць, выказаць уласныя думкі («Эрнест Хемінгуэй як прадстаўнік “страчанага пакалення” пісьменнікаў», «Легендарная і гістарычная мінуўшчына ў адлюстраванні сучаснай беларускай драматургіі»);

— **праблемныя** — прысвечаны разгляду і аналізу пэўнай праблемы («Праблема “бацькоў і дзяцей” у творчасці І. Тургенева і І. Шамякіна», «Дабро і Зло як два полюсы жыцця ў апавяданнях Анатоля Казлова»);

— **абагульняючыя** — разглядаецца пэўнае пытанне, твор ці творчасць пісьменніка цалкам («Леанід Дранько-Майсюк — паэт, празаік, эсэіст», «Алесь Разанаў — паэт-філосаф (станаўленне творчай індывідуальнасці)»);

— **даследчыя** — самастойны аналіз пытання ці праблемы, якія выходзяць за межы таго, што вывучаецца Вамі на ўроках беларускай літаратуры («Традыцыі класічнай літаратуры і наватарства ў паэзіі Алеся Разанава», «Горад і Вёска як вобразы-сімвалы ў сучаснай беларускай прозе (паэзіі)»).

Вельмі часта тэма фармулюе праблему, з пункту гледжання якой разглядаецца прадмет даследавання, напрыклад: *«Псіхалагічны партрэт пакалення ў сучаснай беларускай прозе».*

**Мэта даследавання** — асноўны напрамак даследчыцкай дзейнасці, яе фармулёўка дазваляе вызначыць, навошта праводзіцца даследаванне.

Так, для тэмы «Псіхалагічны партрэт пакалення ў сучаснай беларускай прозе» мэта можа быць сфармулявана наступным чынам: *з дапамогай цэласнага аналізу літаратурных твораў даследаваць працэс фарміравання духоўнасці пэўнага пакалення і мастацкія прыёмы яго раскрыцця.*

**Задачы даследавання** канкрэтызуюць мэту, удакладняюць ход працы, што адлюстроўваецца ў змесце работы: змест кожнай задачы раскрываецца ў пэўным раздзеле. Абавязковай задачай даследавання з’яўляецца тэарэтыка-бібліяграфічны аналіз праблемы (аналіз літаратуразнаўчых і крытычных крыніц, прысвечаных тэме, аб’екту і прадмету даследавання).

Для навукова-даследчай работы «Псіхалагічны партрэт пакалення ў сучаснай беларускай прозе» задачы могуць быць наступнымі:

1) *вывучыць крытычную і тэарэтычную літаратуру па тэме даследавання;*

2) *прааналізаваць найбольш вызначальныя, дамінантныя творы Алеся Асташонка, Андрэя Федарэнкі, Юрыя Станкевіча, Алены Брава;*

3) *апісаць прыёмы і сродкі стварэння вобразаў герояў, уласцівыя розным мастакам слова;*

4) *з дапамогай супастаўляльнага аналізу выявіць сапраўдныя, а не ўяўныя каштоўнасці, якія сцвярджаюцца пісьменнікамі ў рэчышчы закранутай праблемы;*

5) *выявіць рысы наватарства, уласцівыя аналізуемым творам.*

Пад **аб'ектам даследавання** разумеецца працэс ці з'ява, якая стварае праблемную сітуацыю, матэрыял, на якім праводзіцца даследаванне.

Так, пры напісанні даследавання на тэму «Псіхалагічны партрэт пакалення ў сучаснай беларускай прозе» *аб'ектам з'яўляюцца творы А. Асташонка, А. Федарэнкі, Ю. Станкевіча, А. Брава, з якіх перад чытачом паўстае збіральны партрэт пакалення, чыя маладосць і пачатак сталення прыпадае на апошнюю трэць XX стагоддзя.*

Пад **прадметам** даследавання маецца на ўвазе тое, што знаходзіцца ў рамках аб'екта: аспект праблемы, пры даследаванні якога цалкам пазнаецца аб'ект, яго галоўныя рысы.

Для названай вышэй работы *прадметам даследавання становяцца сродкі і прыёмы стварэння псіхалагічнага партрэта маладога пакалення ў сучаснай беларускай прозе.*

Калі Вы вызначыліся з асноўнымі паняццямі і сутнасцю тэмы, можна прыступаць да пошуку інфармацыі для напісання рэферата ці даклада, вызначыўшы **ключавыя словы**, якія нясуць асноўную сэнсавую нагрузку, вызначаюць прыкмету прадмета, стан або дзеянне. Ключавыя словы з'яўляюцца надзейным арыенцірам пры пошуку інфармацыі.

## Пытанні і заданні

1. Што Вы разумееце пад тэмай, мэтай і задачамі даследавання? Сфармулюйце некалькі тэм, прысвечаных жыццёваму і творчаму шляху Вашага любімага пісьменніка. Паспрабуйце напісаць мэту і задачы да тэмы даследавання.

2. У чым адрозненне паміж аб'ектам і прадметам даследавання? Вызначце аб'ект і прадмет даследавання для тэм «Прытчавы пачатак у прозе Янкі Сіпакова», «Проза Раісы Баравіковай для дзяцей і падлеткаў», «Кніга Анатоля Сыса "Лён": адметнасць зместу і структуры», «Класічныя вершаваныя формы ў сучаснай беларускай паэзіі», «Жанр навелы ў беларускай прозе пачатку XXI стагоддзя» (*на выбар*).

3. Самастойна ці з дапамогай настаўніка сфармулюйце або выберыце з прапанаванага спісу тэму даследавання. Паспрабуйце вызначыць мэту, задачы, аб'ект і прадмет даследавання.

4. Прааналізуйце і пры неабходнасці адрэдагуйце і адкарэкціруйце прапанаваныя мэты, задачы, аб'екты і прадметы даследаванняў:

а) *Тэма:* «Маладое пакаленне на вайне (паводле творчасці Івана Навуменкі)».

*Мэта* даследавання — вызначыць спецыфіку адлюстравання паводзін маладога пакалення на вайне на прыкладзе твораў Івана Навуменкі, паказаць майстэрства пісьменніка ў адлюстраванні працэсу духоўнага сталення падлеткаў у часы трагічных выпрабаванняў.

Для дасягнення пастаўленай мэты вырашаюцца наступныя *задачы*:

1) пазнаёміцца з крытычнай літаратурай і творамі Івана Навуменкі на дадзеную тэматыку;

2) прааналізаваць стаўленне мастака слова да падзей Вялікай Айчыннай вайны;

3) вызначыць і ахарактарызаваць тэматычны дыяпазон прозы І. Навуменкі;

4) паказаць эвалюцыю вобразаў падлеткаў у творах І. Навуменкі;

5) вызначыць мастацкую дамінанту ў аўтарскім адлюстраванні працэсу сталення маладога пакалення на вайне.

*Прадмет* даследавання — адлюстраванне Іванам Навуменкам працэсу духоўнага сталення маладога пакалення на вайне.

*Аб'ект* даследавання — празаічныя творы Івана Навуменкі (апавяданні «Сямнаццатай вясной», «Хлопцы самай вялікай вайны…», раманы «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах» і «Сорак трэці»).

б) *Тэма:* «Канфлікты і характары ў п'есах А. Макаёнка "Зацюканы апостал" і "Пагарэльцы"».

*Мэтай працы* з'яўляецца вывучэнне адметнасцей канфліктаў і характараў у п'есах «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы» Андрэя Макаёнка.

Акрэсленая мэта рэалізуецца праз дасягненне наступных *задач*:

1) пазнаёміцца з крытычнай літаратурай па тэме даследавання і творамі А. Макаёнка;

2) вызначыць праблемы і канфлікты, якія раскрывае мастак слова ў сваіх п'есах;

3) ахарактарызаваць сродкі стварэння мастацкіх вобразаў у творах «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы»;

4) вызначыць духоўныя арыентацыі герояў у вышэйназваных п'есах;

5) паказаць адрозненне і падабенства канфліктаў і характараў у творах «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы»;

6) вызначыць актуальнасць драматургічнай спадчыны А. Макаёнка для нашага часу.

*Прадметам* даследавання з'яўляюцца канфлікты і характары, адлюстраваныя ў трагікамедыях.

*Аб'ект* вывучэння — п'есы знакамітага драматурга «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы».

в) *Тэма:* «Рысы рамантызму ў паэмах Янкі Купалы».

*Мэта* работы — праз комплексны аналіз паэм Янкі Купалы выявіць уплыў эстэтыкі рамантызму на стыль мастака, вызначыць рысы і характэрныя асаблівасці рамантычнага адлюстравання жыцця ў творах паэта.

Рэалізацыя акрэсленай мэты адбываецца праз вырашэнне наступных *задач*:

1) зрабіць агляд літаратуразнаўчай і крытычнай літаратуры па даследаванні рамантычных рыс у паэмах Янкі Купалы;

2) вызначыць рамантычныя рысы ў паэмах Янкі Купалы;

3) правесці класіфікацыю паэм класіка нацыянальнай літаратуры;

4) комплексна і сістэмна даследаваць выяўленне спецыфічных рыс рамантызму ў творчасці Янкі Купалы (у прыватнасці, у яго паэмах);

*Прадмет* даследавання — выяўленне і трансфармацыя эстэтыкі рамантызму ў паэмах Янкі Купалы.

*Аб'ект* даследавання — паэмы Янкі Купалы («Нікому», «Зімою», «Адплата кахання», «Адвечная песня», «Сон на кургане», «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я»).

*Калі ў Вас і ў аднакласнікаў, што наведваюць разам з Вамі факультатыўныя заняткі, атрымалася сфармуляваць не адну, а некалькі тэм, якія падаюцца Вам арыгінальнымі і актуальнымі, Вы можаце правесці своеасаблівую* ***«выставу-кірмаш» тэм****. Магчыма, камусьці з даследчыкаў-пачаткоўцаў Вы дапаможаце знайсці тую тэму, якой ён так і не здолеў адшукаць; з другога боку, у Вас будзе магчымасць параўнаць свае здабыткі з плёнам сваіх калег.*

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Праца з літаратуразнаўчымі крыніцамі спрыяе развіццю даследчых здольнасцей, асабліва калі для падрыхтоўкі выкарыстоўваецца некалькі крыніц розных відаў. Вывучэнне кожнай з іх паглыбляе і пашырае веды па вывучаемым пытанні, дае магчымасць абагуліць здабыткі вучоных па дадзенай праблеме, развівае самастойнасць у ацэнцы літаратурных з’яў.

З ліку відаў навукова-даследчых работ вылучаюцца навуковыя артыкулы, рэфераты, даклады, праекты.

**Навуковы артыкул** — закончанае і лагічна цэласнае міні-даследаванне, прысвечанае канкрэтнаму пытанню, мэта якога — прааналізаваць пэўную з’яву з пункту гледжання заканамернасцей, якія знаходзяцца ў яе аснове. Артыкулу ўласцівы тэарэтычныя і практычныя абагульненні, аналіз фактаў і з’яў. Падобныя даследаванні прысвечаны актуальным і важным пытанням літаратуразнаўства.

**Рэферат** — слова лацінскага паходжання, даслоўна перакладаецца як «напісанне паведамлення або публічнага даклада». Часцей за ўсё гэтае слова ўжываецца для азначэння паслядоўнага, пераканаўчага і кароткага выкладу зместу або вылучэння сутнасці пэўнага пытання або тэмы навукова-практычнага характару.

Пачынаць працу над рэфератам мэтазгодна з літаратуразнаўчага артыкула (артыкулаў): напачатку прачытаць яго, потым скласці план, «разгарнуць» план у тэзісы, знайсці ў тэксце аўтарскія аргументы для пацвярджэння тэзісаў і, нарэшце, аформіць рэферат.

Пад **дакладам** разумеецца не проста выклад зместу той ці іншай крыніцы (крыніц), але і яе ацэнка, выяўленне сваёй

пазіцыі: згода з тэзісамі ці аспрэчванне тэзісаў, выказаных у навуковым артыкуле, па якім пішацца даклад; крытычнае стаўленне да аргументаў, якія выкарыстаны аўтарам («Сродкі мастацкай псіхалагізацыі ў прозе Васіля Быкава», «Праблема віны і пакаяння ў творах Васіля Быкава і Генрыха Бёля», «“Родныя дзеці” Ніла Гілевіча як узор сучаснага паэтычнага эпасу»).

Такім чынам, у адрозненне ад рэферата, у дакладзе абавязкова павінна прысутнічаць ацэнка думак, меркаванняў, выказаных аўтарамі артыкулаў, можна згаджацца ці дыскутаваць з аўтарамі, прыводзіць свае аргументы і контраргументы.

Падчас працы над рэфератам і дакладам можна выкарыстоўваць наступную табліцу:

| **План** | **Тэзіс** | **Аргументы** | |
|---|---|---|---|
| | | 1 крыніца | 2 крыніца |

**Даследчы праект** — праблемная даследчая работа, якая мае практычна афармленыя вынікі групавой ці індывідуальнай дзейнасці (часопісы, альманахі, прэзентацыі, відэафільмы і інш.).

## Пытанні і заданні

1. У чым заключаецца асноўнае адрозненне паміж рэфератам і дакладам?
2. Сфармулюйце па дзве тэмы даклада і рэферата, прысвечаных даследаванню творчасці Уладзіміра Караткевіча.
3. Што такое даследчы праект? Ці рыхтавалі Вы праекты па літаратуры?
4. Прааналізуйце прапанаваныя настаўнікамі рэфераты і даклады, адзначце іх вартасці і недахопы.

## ЗБОР ІНФАРМАЦЫІ ПА ТЭМЕ ДАСЛЕДАВАННЯ

Збор інфармацыі па тэме — адзін з самых адказных і працяглых этапаў падрыхтоўкі навуковага даследавання. Для выбару кніг і збору інфармацыі Вы можаце карыстацца любой бібліятэкай — школьнай, гарадской, абласной. У кожнай з іх шмат кніг — тысячы, дзясяткі тысяч, у некаторых — сотні тысяч. Бібліятэкі — своеасаблівы «кландайк» для чытача, што адчувае сябе золаташукальнікам, якому трэба знайсці драбінкі золата ў пяску і каменні.

Прапануем Вам адрасы і сайты буйнейшых рэспубліканскіх бібліятэк:

• Нацыянальная бібліятэка Беларусі, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 116,(www.nlb.by).

• **Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь,** г. Мінск, вул. Савецкая, 11, (www.preslib.org.by).

• **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі,** г. Мінск, вул. Сурганава, 15, (www.bas-net.by).

• Фундаментальная бібліятэка БДУ, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, (www.library.bsu.by).

• Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка Беларусі, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 7, (www.rlst.org.by).

• Беларуская лічбавая бібліятэка, (www.library.by).

Перад кожным, хто хоча нешта дасканала вывучыць, паўстае пытанне: якая літаратура наогул існуе па дадзенай тэме. Колькасць кніг, газет, часопісаў і іншых твораў настолькі вялікая, што чалавек, не падрыхтаваны да працы з вялікай інфармацыйнай плынню, можа разгубіцца. Сярод мноства кніг і артыкулаў па тым або іншым пытанні сустракаюцца творы рознай ступені складанасці, рознай навуковай і практычнай значнасці.

Аднак абазнаны чытач умее знаходзіць патрэбныя кнігі. Ключ да гэтага — каталогі. **Каталог** — неабходная прыналежнасць кожнай бібліятэкі. Ён служыць пасярэднікам паміж кнігай і чытачом, дапамагае чытачу пазнаёміцца з бібліятэкай, з багаццем яе фондаў. Каталогі бываюць:

— **алфавітныя** (генеральныя і чытацкія);

— **сістэматычныя** (па храналогіі выдання);

— **прадметныя** (карткі згрупіраваны па прадметах і ў межах кожнага прадмета размешчаны па алфавіце).

Таксама на дапамогу даследчыку прыходзіць **бібліяграфія**, задача якой — дапамагчы разабрацца ў навуковай значнасці кніг, параіць чытачам лепшую літаратуру і тым самым дапамагчы вылучыць з масы друкаваных выданняў найбольш патрэбныя. **Бібліяграфічны паказальнік** — гэта пералік кніг, артыкулаў і іншых крыніц інфармацыі, якія знаходзяцца ў даведачна-інфармацыйным аддзеле бібліятэкі.

**Электронныя бібліяграфічныя сродкі** — электронныя каталогі і бібліяграфічныя паказальнікі, якія сёння ёсць, бадай, у кожнай бібліятэцы. Асноўнымі з іх з’яўляюцца:

— Віртуальная чытальная зала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (http://portal.nlb.by);

— Электронны каталог Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (http://portal.nlb.by);

— Віртуальная даведка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Спытай у бібліятэкара» (http://www.nlb.by).

Прагледзеўшы розныя бібліяграфічныя паказальнікі, Вы можаце адабраць дастатковую колькасць неабходных кніг і артыкулаў, каб пазней адшукаць іх у фондзе бібліятэкі.

У працэсе падрыхтоўкі даследавання можна таксама выкарыстоўваць дапаможнікі і даведнікі, іншую даведачную літаратуру, прызначаную для хуткага атрымання звестак навуковага, практычнага ці пазнавальнага характару. Навуковасць — прыкмета любога даведачнага выдання. Карыстаючыся энцыклапедыяй або слоўнікам, Вы можаце быць упэўнены ў тым, што карыстаецеся дакладнымі і выверанымі дадзенымі.

У слоўніках і энцыклапедыях асноўныя структурныя элементы размяшчаюцца ў алфавітным парадку; у даведніках, як правіла, выкарыстоўваецца пэўная лагічная сістэма,

у аснову якой можа быць пакладзены тэматычны, храналагічны або іншы прынцып. Вельмі важным з'яўляецца апарат даведачнага выдання, кожны элемент якога — змест, прадмова, пералік умоўных абазначэнняў і скарачэнняў, бібліяграфічны спіс, паказальнікі — сваімі сродкамі паляпшае пошукавую сістэму выдання.

Асноўныя тыпы даведачных выданняў: ***энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі***.

Падчас падрыхтоўкі навукова-даследчай працы па літаратуры Вы можаце карыстацца наступнымі энцыклапедыямі, слоўнікамі і даведнікамі:

Беларуская драматургія, 1966—1986: бібліяграфічны даведнік / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад. Н. Б. Ватацы; навук. рэд. Т. Я. Гаробчанка. — Мінск : НББ, 1993. — 445 с.

Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік : у 6 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1992—1995.

Беларускія пісьменнікі (1917—1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі; навук. рэд. А. Л. Верабей. — Мінск : Маст. літ., 1994. — 653 с. іл.

Беларускія пісьменнікі на старонках часопіса «Роднае слова» : бібліягр. паказ. / Бел. асац. «Конкурс»; склад. А. В. Высоцкая [і інш.]. — Мінск : Бел. асац. «Конкурс», 2008. — 256 с.

Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. — Мінск : Маст. літ.,1973. — 336 с.

*Лазарук, М. А.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: дапам. для настаўнікаў / М. А. Лазарук, М. А. Ленсу. — Мінск : Нар. асвета, 1996. — 177 с.

*Рагойша, В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік : тэрміны і паняцці : для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. — Мінск : Нар. Асвета, 2009. — 303 с.

*Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — Мінск : Беларуская навука, 2004. — 576 с.

*Рагойша, В. П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. — 384 с.

Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік. — Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1988. — 608 с.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993—2004.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. — Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1984—1987.

Якуб Колас: Да 100-годдзя з дня нараджэння. Біябібліягр. паказ. / склад. Н. Б. Ватацы, М. І. Пратасевіч, Н. А. Адамовіч, А. Б. Дунаеўская; рэд. В. П. Рагойша. — Мінск : Дзяржбібліятэка БССР, 1983. — 422 с.

Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік. — Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1986. — 727 с.

Для напісання навукова-даследчай работы Вы можаце выкарыстоўваць *манаграфіі* — навуковыя выданні па пэўнай праблеме, прысвечаныя разгляду творчасці пісьменніка цалкам ці пэўнаму аспекту яго майстэрства; *навуковыя і навукова-папулярныя кнігі*; *зборнікі навуковых артыкулаў*, *падручнікі* і *дапаможнікі*; *часопісы* «Роднае слова», «Беларуская мова і літаратура», «Полымя», «Маладосць» і інш., а таксама *газеты* — найперш «Літаратуру і мастацтва» («ЛіМ»).

Падчас падрыхтоўкі навукова-даследчай работы па літаратуры Вы можаце карыстацца наступнымі манаграфіямі, навуковымі і навукова-папулярнымі кнігамі; зборнікамі навуковых артыкулаў, падручнікамі і дапаможнікамі:

*Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура ХХ стагоддзя: гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005. — 270 с.

*Васючэнка, П.* Сучасная беларуская драматургія : дапаможнік для настаўнікаў / П. Васючэнка. — Мінск : Маст. літаратура, 2008. — 158 с.

Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. ім. Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск : Бел. навука, 1999—2003.

*Грамадчанка, Т. К.* Сучасны беларускі раман: дынаміка жанру / Т. К. Грамадчанка. — Мінск : БДПУ, 2006. — 234 с.

*Дасаева, Т. М.* Паэтыка лірызму ў беларускай прозе / Т. М. Дасаева. — Мінск : Выд-ва БДУ, 2001. — 152 с.

*Кісліцына, Г.* Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Г. Кісліцына. — Мінск : Логвінаў, 2006. — 208 с.

*Мішчанчук, М. І.* Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. — Мінск : Выш. шк., 2001. — 352 с.

На парозе 90-х: Літ. агляд / АН Беларусі, Ін-т літ. ім. Я. Купалы; М. М. Арочка, П. К. Дзюбайла, С. С. Лаўшук. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 208 с.

Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку / С. А. Андраюк [і інш.]; навук. рэд. В. М. Стральцова. — Мінск : Беларуская навука, 2008. — 283 с.

*Тычына, М.* На паввароце: Беларуская літаратура канца XX ст. / М. Тычына // Роднае слова. — 2001. — № 4. — С. 8—11.

*Тычына, М.* На паввароце: Беларуская літаратура канца XX ст. / М. Тычына // Роднае слова. — 2001. — № 6. — С. 6—10.

*Тычына, М.* На паввароце: Беларуская літаратура канца XX ст. / М. Тычына // Роднае слова. — 2001. — № 9. — С. 16—19.

Калі адбор літаратуры (і іншага матэрыялу) завяршыўся і Вы знайшлі патрэбнае, трэба пераключыцца на новую працу — успрыманне і вывучэнне тэкстаў. У залежнасці ад характару матэрыялу, пэўных мэт і ўмоў работы выкарыстоўваюцца розныя прыёмы чытання: азнаямленчае і чытанне з вывучэннем, падрабязнае і выбарачнае, хуткае і павольнае.

**Азнаямленчае чытанне** дазваляе атрымаць пра кнігу або артыкул першае агульнае ўражанне. Для таго, каб навучыцца хутка і ў той жа час уважліва праглядаць кнігі, трэба знайсці найбольш мэтазгодны парадак прагляду. Некаторыя чытачы спрашчаюць працэс прагляду кнігі, зводзячы яго да знаёмства з анатацыяй. Але, па-першае, анатацыя да кнігі нярэдка адсутнічае, а, па-другое, яна не заўсёды дае дакладнае ўяўленне пра кнігу.

Пры **азнаямленчым** праглядзе кнігі ў асноўным трэба прытрымлівацца наступнага парадку:

— уважліва прачытаць тытульны ліст (не вокладку!), дзе пазначаны прозвішча аўтара, назва кнігі, месца і год выдання;

— знайсці ў кнізе **Змест** і азнаёміцца з ім, бо ў ім адлюстраваны лагічны план выдання, даецца адказ на пытанне, аб чым і ў якой паслядоўнасці напісана кніга;

— прачытаць або прагледзець **Уводзіны**, каб даведацца пра змест кнігі, зразумець яе прызначэнне і мэту, крыніцы і характар звестак, якія змяшчаюцца ў ёй;

— прачытаць **Анатацыю**, у якой указваюцца асноўныя звесткі пра мэту і змест выдання;

— пазнаёміцца з **Асноўным тэкстам** твора, прачытаўшы некаторыя ўрыўкі з яго, абзацы, найбольш важныя і цікавыя раздзелы;

— прагледзець **Заключэнне** да кнігі, дзе коратка фармулююцца або ў скандэнсаваным выглядзе паўтараюцца асноўныя тэзісы, падрабязна выкладзеныя ў творы.

Асаблівая ўвага павінна быць скіравана на даведачны апарат кнігі — прадметныя, імянныя і іншыя паказальнікі, якія могуць быць у кнізе, а таксама на малюнкі, табліцы, карты, схемы, дыяграмы.

**Чытанне з вывучэннем** мае сваёй мэтай дэталёвае засваенне ўсяго зместу работы або яе часткі. Гэтым спосабам чытаюцца першакрыніцы, дакументы, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі, артыкулы.

Чытанне з вывучэннем звычайна бывае павольным, удумлівым, калі звяртаецца ўвага на кожны раздзел працы ці артыкула.

Па сваім характары чытанне бывае **падрабязным** або **выбарачным**. Пры першым з іх не робіцца ніякіх пропускаў, увесь тэкст чытаецца цалкам; пры другім — у поле зроку знаходзяцца толькі асобныя часткі, а ўсё астатняе толькі праглядаецца. Выбар таго або іншага спосабу чытання залежыць як ад характару матэрыялу, так і ад чытацкай зацікаўленасці.

Па тэмпе чытанне бывае **хуткім** і **павольным**. Азнаямленчае чытанне звычайна характарызуецца хуткасцю, а чытанне з вывучэннем — павольнасцю.

Адно з пытанняў, якое паўстае перад чытачом: пісаць ці не пісаць на кнігах? Рабіць у кнігах нататкі, падкрэсліваючы, выносячы на палі заўвагі, спецыяльныя знакі, у многіх увайшло ў звычку. ***Аднак трэба памятаць, што падобным чы-***

***нам Вы можаце працаваць толькі са сваёй уласнай кнігай, бібліятэчныя і чужыя кнігі нельга псаваць.***

Падкрэсліванні павінны па-свойму арганізоўваць тэкст, таму варта падкрэсліваць словы, нягледзячы на знакі прыпынку, аб'ядноўваючы розныя словы стрэлкамі. Варта ўлічваць тое, што на старонцы двухбаковыя палі — знешнія і ўнутраныя, — і рабіць запісы толькі на адных з іх, часцей за ўсё знешніх. Можна выкарыстаць сістэму ўмоўных знакаў:

! !! !!! — важна, вельмі важна, звярнуць увагу;

? — сумненне;

= — знак роўнасці, тое самае;

>< — больш, менш.

√ — устаўка;

: ∩ — паўтор, супярэчанне;

∑ — сума, вынік, выснова;

∑∑ — агульная выснова;

NB — варта запомніць;

W — наадварот;

PS — напісанае пазней, дапаўненне.

Падчас працы з літаратурай варта таксама выкарыстоўваць закладкі, на выступаючай частцы якіх можна рабіць запісы.

Уменне рабіць выпіскі — аснова работы над любой кнігай. Яны дапамагаюць сабраць і сістэматызаваць вялікі матэрыял, патлумачыць факты, прааналізаваць аргументы, выявіць процілегласці і г. д.

У адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да навукова-даследчых работ, неабходна скласці спіс літаратуры і аформіць выпіскі з крыніц, якія Вы выкарысталі. Перад вамі некалькі кніг, артыкулы з часопісаў і газет, выпісы з энцыклапедый і даведнікаў. Як правільна ўсё гэта запісаць? Якія звесткі аб крыніцы трэба паказаць, у якім парадку?

Асноўнымі відамі запісаў з'яўляюцца цытаты, тэзісы, канспект.

**Цытаты** (ад лац. «заклікаю ў сведкі») — гэта выпісы з тэксту кніг (артыкулаў) слоў, сказаў, прыкладаў, звестак словамі аўтара. Пры афармленні цытат трэба прытрымлівацца наступных правіл:

1. Цытаваць па магчымасці закончанымі часткамі тэксту (сказамі, невялікімі абзацамі).

2. Кожную цытату трэба браць у двукоссе, у канцы пасля двукосся ў квадратных дужках даецца спасылка на бібліяграфічны спіс з указаннем нумару крыніцы і старонкі або старонак: [17, с. 177] або [17, с. 177—178].

***Напрыклад:*** Вядомы літаратуразнаўца і крытык П. Дзюбайла так вызначыў перспектывы развіцця сучаснага слоўнага мастацтва: «Далейшае развіццё нашай прозы, узмацненне яе духоўнага патэнцыялу, відаць, будзе праходзіць па шляху павышэння ідэйна-мастацкіх, маральных крытэрыяў, паглыблення псіхалагізму, пазбаўлення ад уяўнага інтэлектуалізму, меладраматызму, інфантылізму. Проза па-ранейшаму будзе знаходзіцца ў пошуках героя — чалавека працы, чалавека высокай маральнасці, духоўнасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі, чалавека, які жыве ўсімі складанымі турботамі нашага часу» [17, с. 177].

3. Калі цытату выпісваюць з сярэдзіны сказа, то пасля першага двукосся ставяць тры кропкі.

***Напрыклад:*** Аўтарытэтам для Васкевіча быў і брат Сцяпан, якога Антон з самага дзяцінства лічыў «…лепшым сваім сябрам, самым блізкім па духу чалавекам. Антон слухаўся яго і пабойваўся» [43, с. 98].

4. У выпадку пропуску аднаго або некалькіх слоў у сярэдзіне цытуемага тэксту замест пропуска (слоў, сказаў) ставяцца тры кропкі.

***Напрыклад:*** Як аказваецца, акрамя таго, што Валодзя вельмі разважлівы, для яго яшчэ характэрна самакрытычнасць. Гэта выяўляецца ў яго знешнасці: «Мне дваццаць чатыры гады, але фізічна я складзены як пятнаццацігадовы падлетак … зморшчаны, скура нясвежая — відаць, ад цыгарэт. А як страшэнна я схуднеў за гэты год!» [44, с. 21], а таксама ў яго адносінах да сябе.

5. Тры кропкі ставяцца таксама ў канцы цытаты, перад двукоссем, калі сказ цытуецца не цалкам.

***Напрыклад:*** Антон паграажае ўяўным сваім крыўдзіцелям: «Вы яшчэ пашкадуеце, будзеце прасіць…» [43, с. 88], але прасіць, як потым выявілася, ніхто і не збіраўся, а сам ён асабліва дзейнічаць не імкнуўся, тым самым паказваючы сваю пасіўнасць.

6. Цытуючы, неабходна дакладна захоўваць усе вылучэнні, ужытыя аўтарам (курсіў, тлусты шрыфт, разрадку і г. д.).

***Напрыклад:*** Многія з пералічаных твораў пісьменніка і навукоўца ўяўляюць сабой пранікнёныя оды мове беларусаў — чыстай,

выразнай, сакаўной і такой дарагой і любай пісьменніку: «*У людзі выходзіць!* У свет выходзіць!.. Людзьмі звацца!.. *Жыць людзьмі!.. Не толькі імі называцца!..*» [4, с. 8].

Калі якія-небудзь вылучэнні ўносяцца самім чытачом, то гэта павінна быць адзначана наступным чынам *(*вылучана намі. — ***Ініцыялы****)*.

***Напрыклад:*** Лірычны герой вершаў Міколы Мятліцкага паўстае выгнаннікам («Брыдуць яны — палоннікі журбы / **Выгнаннікі** *(*вылучана намі. — ***І. Г.****)* заложнікі нядолі» [15, с. 256]), які не можа пераадолець адлучанасць ад роднай зямлі, ад блізкіх, дарагіх сэрцу мясцін.

7. Калі тэкст цытуецца не па першакрыніцы, а па іншым выданні, то спасылку варта пачынаць словамі «Цыт. па...».

8. Вершы могуць цытавацца па цэнтры радка з захаваннем аўтарскіх вылучэнняў і правапісу, а спасылка на крыніцу (зборнік, кнігу) падаецца ў квадратных дужках.

***Напрыклад:*** Лірычны герой паэзіі Пімена Панчанкі гэтага перыяду не знаходзіцца ў еднасці з прыродай, ён актыўны пераўтваральнік сусвету:

Я мару, каб пілоты баявыя
Наўчыліся, забыўшы ўсе баі,
Сшываць, як ветразь, воблакі малыя
У хмары і зямлю дажджом паіць [5, с. 8].

Вершаваныя цытаты могуць уводзіцца ў тэкст; тады пасля кожнага паэтычнага радка ставіцца адна або дзве рыскі (/ або //), а спасылка на крыніцу (зборнік, кнігу) падаецца ў квадратных дужках.

***Напрыклад:*** Лірычны герой паэзіі Пімена Панчанкі гэтага перыяду не знаходзіцца ў еднасці з прыродай, ён актыўны пераўтваральнік сусвету: «Я мару, каб пілоты баявыя / Наўчыліся, забыўшы ўсе баі, / Сшываць, як ветразь, воблакі малыя / У хмары і зямлю дажджом паіць» [5, с. 8].

9. Калі выкарыстоўваюцца ўскосныя цытаты — выкарыстоўваецца ідэя даследчыка ці адвольна пераказваецца яе змест, яны не выдзяляюцца двукоссем, а ў квадратных дужках даецца толькі спасылка на нумар крыніцы ў спісе літаратуры. Аднак, па магчымасці, варта пазбягаць падобных цытат.

***Напрыклад:*** Менавіта з другой паловы 80-х гадоў мінулага стагоддзя пачынаецца новы этап у развіцці беларускай літаратуры,

этап уваходжання ў яе маладой літаратурнай хвалі. Дарэчы, далёка не ўсе крытыкі ацэньваюць яе аптымістычна найперш таму, што сярод агульнай масы сучасных пісьменнікаў толькі нямногія могуць ганарыцца мастацкай арыгінальнасцю сваіх пошукаў. Тым не менш, з'яўленне наватарскіх твораў маладых пісьменнікаў нельга назваць негатыўнай з'явай, як і нельга назваць негатыўным спадарожны ёй працэс уздыму нацыянальнай свядомасці [8].

Існуюць наступныя агульныя патрабаванні да адбору фактаў, прыкладаў і цытат, якія павінны быць:

— пэўнымі і дакладнымі;

— падпарадкаваныя агульнай ідэі;

— важнымі і істотнымі.

Цытаты лепш выпісваць на картках, якія могуць мець наступны выгляд:

| |
|---|
| Аўтар<br>Назва кнігі<br>Выходныя дадзеныя<br>Цытата<br>Старонка |

**Выпіскі ў форме картак даюць магчымасць:**

1) працаваць над многімі крыніцамі адначасова, спалучаць розныя цытаты ў межах аднаго даследавання;

2) аптымізаваць работу над тэмай пры з'яўленні новых крыніц інфармацыі;

3) рабіць класіфікацыю цытат.

**Тэзісы** (ад грэч. «сцвярджаю») — больш складаная і дасканалая форма запісу. Тэзісы бываюць **простымі** (кароткімі), калі яны ўтрымліваюць толькі адно сцвярджэнне, і **складанымі** (разгорнутымі), калі яны падмацоўваюцца довадамі, аргументамі. Калі па ступені паўнаты тэзісы дзеляцца на **кароткія** і **разгорнутыя**, то па спосабе выкладу іх можна падзяліць на **тэкстуальныя** і **вольныя**. У тэкстуальных тэзісах перадаецца асноўная думка працы словамі аўтара тэксту. У вольных тэзісах важна захоўваць без скажэння галоўную думку крыніцы (тэксту), выказаць жа яе можна сваімі словамі, каб надаць тэзісам сцісласць і лаканічнасць.

Асноўная мэта напісання любых тэзісаў — падагуліць наяўны матэрыял, падаць яго сутнасць у кароткіх фармулёўках, перадаць змест вялікай па аб'ёме публікацыі або даклада; высвятліць пытанне, прааналізаваць яго.

Галоўнае адрозненне тэзісаў — невялікі аб'ём (1—2 друкаваныя старонкі), у якім неабходна выказаць усе асноўныя ідэі даклада (артыкула).

Апошнім часам шырока распаўсюджана практыка, калі па выніках разгляду тэзісаў дакладаў аргкамітэт канферэнцыі не толькі прымае рашэнне пра ўключэнне адпаведнага даклада ў праграму канферэнцыі, але і пра яго публікацыю.

Любыя тэзісы могуць быць аднесены да аднаго з двух асноўных тыпаў:

*1. Тэзісы, складзеныя па публікацыі іншага аўтара.*

*2. Тэзісы, напісаныя на аснове ўласнага арыгінальнага матэрыялу.*

У першым выпадку аўтар тэзісаў павінен вывучыць публікацыю; пасля папярэдняга азнаямлення тэкст чытаецца паўторна, з падзелам яго на часткі. Затым трэба знайсці ў кожнай частцы асноўную думку і выпісаць яе. Асноўнай складанасцю пры напісанні падобных тэзісаў з'яўляецца неабходнасць значнага змяншэння аб'ёму друкаванага тэксту пры максімальным захаванні яго зместу.

Пры тэзіраванні публікацый іншага аўтара можна выкарыстаць наступную схему запісаў:

| **План** | **Тэзіс** |
|---|---|

Да другога тыпу адносяцца тэзісы ўласных навуковых работ — дакладаў, прэзентацый, артыкулаў і інш. У гэтым выпадку аўтар добра ведае тэкст, і яго асноўнай задачай з'яўляецца кароткі і змястоўны выклад пытання ў пісьмовай форме. Асноўная складанасць заключаецца ў тым, што аўтар не да канца сфарміраваў сваё ўяўленне аб тым, пра што трэба напісаць.

**Структура тэзісаў па ўласным матэрыяле** можа быць наступнай:

1. Кароткі ўступ (актуальнасць тэмы).
2. Мэта работы (паставіць праблему / задачу).

3. Агляд наяўных пунктаў гледжання на праблему.

4. Уласныя думкі на гэтую тэму.

5. Вывад.

Можна вылучыць **агульныя патрабаванні** да напісання тэзісаў:

— кожнае сцвярджэнне (тэзіс) павінна быць кароткім і змястоўным;

— кожнае сцвярджэнне павінна быць абгрунтавана альбо логікай, альбо эмпірыкай (вопытам);

— навуковы стыль маўлення;

— нават непадрыхтаваны чытач павінен зразумець ваш тэкст.

І адно з самых галоўных патрабаванняў: *не перапісвайце гатовыя тэксты з інтэрнэта!*

Ваш настаўнік не менш за Вас абазнаны ў магчымасцях Сеціва, таму выявіць факт плагіяту яму будзе нескладана. Акрамя таго, калі Вы наважыліся на самастойнае даследаванне, будзьце паслядоўнымі — не прыніжайце сябе інтэлектуальным крадзяжом.

**Канспект** (ад лац. «агляд», «выклад») — найбольш складаная і дасканалая форма запісу прачытанага, якая спалучае ў сабе шматлікія віды запісаў — цытаты, план, тэзісы. Канспект — гэта не проста скарочаны варыянт тэксту, а згустак яго зместу, пададзены ў лагічнай сістэме абгрунтаваных вывадаў, таму, не прачытаўшы ўвесь тэкст і не асэнсаваўшы яго змест, нельга механічна скарачаць і рабіць запісы.

Канспекты бываюць **тэкстуальнымі, вольнымі, змешанымі**. Канспект атрымаецца тэкстуальным, калі запіс ідзе ў адпаведнасці з размяшчэннем матэрыялу ў кнізе і ў асноўным словамі тэксту. Канспект будзе вольным, калі думкі выкладаюцца ўласнымі словамі.

Канспект — універсальная форма запісу, таму ў ім могуць спалучацца і цытаванне, і запісы, блізкія да тэксту, і вольны пераказ зместу матэрыялу. Падобны канспект называецца змешаным.

Канспектаванне — складаны від працы, засвоіць яго атрымліваецца не адразу, толькі сістэматычная праца з роз-

нымі відамі літаратуры дапаможа навучыцца канспектаванню.

У працэсе канспектавання можна рабіць запісы па наступнай схеме:

| План | Тэзіс | Аргументы |
|---|---|---|

**Алгарытм напісання тэзісаў і канспектаў:**

1. Прачытайце крыніцу.
2. Вызначыцеся, да якога тыпу будуць адносіцца тэзісы ці канспект, і вызначце адпаведную структуру.
3. Падбярыце рабочую назву тэзісам ці канспекту.
4. Складзіце план тэзісаў ці канспекта. Падумайце аб змястоўным напаўненні кожнага раздзела і напішыце яго асноўную думку (тэзіс) адным сказам насупраць кожнага раздзела плана. Звычайна аднаму раздзелу ў тэксце (дакладней — кожнай ідэі) адпавядае адзін абзац. Калі ў вас атрымалася ў адным раздзеле некалькі ідэй, значыць, гэты раздзел будзе складацца з некалькіх абзацаў.
5. Уважліва прачытайце напісанае і праверце, ці досыць гэтых раздзелаў і абзацаў для поўнага тлумачэння тэмы. Калі не — дапішыце.
6. Па чарзе, пачынаючы з першага абзаца, выкладайце свае думкі або перадавайце змест пэўнай крыніцы.
7. Прачытайце ўвесь атрыманы тэкст цалкам. Адрэдагуйце пераходы паміж абзацамі, змест абзацаў.

## Пытанні і заданні

1. Якія крыніцы інфармацыі Вы ведаеце? Якімі з іх часцей за ўсё карыстаецеся?
2. Адшукайце інфармацыю па абранай Вамі тэме даследавання. Рабіце выпіскі з яе ў форме цытат і тэзісаў.
3. Выпраўце памылкі ў цытатах:

1) Галоўны герой аповесцей **«Paradies auf Erden», «Вернісаж»** — пісьменнік-інтэлігент — так характарызуе сучаснае грамадства: «Хаос. Не, не хаос. У хаосе ёсць завяршэнне,

пачатак і канец... А я не бачу канца нашага развалу... грандыёзны сметнік “вялікай дэмакратыі”» [20, с. 77].

2) Не бачыць канца развалу быцця ў 80—90х гг. XX ст. і былая актрыса, народная артыстка рэспублікі Аляксандра Паўлаўна Астройка (**«Адна на падмостках»**), якая: «… Аслабла ад бездапаможнасці, ад няведання, навошта яе пакуты... пад канец жыцця, калі няма радасці. Няма шчасця...» [20, с. 265].

3) Акідваючы позіркам здзейсненае І. Шамякінам, міжволі прыгадваеш верш Янкі Купалы «З кутка жаданняў»:

З цэлым народам гутарку весці,
Сэрца мільёнаў падслухаць біцця —
Гэткай шукаю цэлы век чэсці,
Гэта адно мне падпорай жыцця...

## СТРУКТУРА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Навукова-даследчая работа павінна змяшчаць наступныя структурныя часткі:

— тытульны ліст;

— змест;

— пералік умоўных абазначэнняў (пры неабходнасці);

— уступ;

— асноўную частку, што складаецца, у сваю чаргу, з некалькіх раздзелаў; у ёй падаецца аналіз навуковай літаратуры па тэме даследавання, апісанне выкарыстаных метадаў, сутнасць і асноўныя вынікі праведзенага даследавання;

— заключэнне;

— спіс літаратуры;

— дадаткі (пры неабходнасці).

Іх можна прадставіць таксама ў выглядзе наступнай схемы:






Ва **Уступе** абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы даследавання, адлюстроўваецца (па магчымасці) месца даследавання сярод іншых навуковых работ у гэтай галіне. Фармулюецца мэта работы і задачы, якія неабходна вырашыць для яе дасягнення, аб'ект і прадмет даследавання. Сцісла выкладаецца структура работы і тлумачыцца логіка яе пабудовы. Указваецца поўны аб'ём даследавання ў старонках, колькасць схем і табліц, а таксама колькасць выкарыстаных бібліяграфічных крыніц.

Уступ — гэта своеасаблівая прадмова, падрыхтоўка да ўспрымання асноўнага матэрыялу даследавання. Ён не павінен быць расцягнутым, перагружаным непатрэбнымі фактамі, якія не маюць дачынення да тэмы. Выкладанне матэрыялу павінна быць кароткім, дакладным, паслядоўным. Неабходна ўжываць літаратуразнаўчыя тэрміны, пазбягаць двухсэнсоўных паняццяў і катэгорый, складаных граматычных канструкцый.

Уступ можа быць *біяграфічным* — кароткія звесткі пра пісьменніка, якія «падводзяць» да вывучэння тэмы (праблемы), *гістарычным* — разгляд гісторыі ўзнікнення і даследавання закранутай тэмы (праблемы) у адпаведнай галіне навукі, *аналітычным* — навуковае абгрунтаванне і аналіз тэмы (праблемы), *параўнальным* — супастаўленне розных (часам супрацьлеглых) поглядаў на тэму (праблему).

**Кампазіцыя Уступа можа быць наступнай:**

— Актуальнасць навуковага даследавання.
— Ступень распрацоўкі праблемы ў літаратуразнаўстве.
— Аб'ект даследавання (мастацкі твор).
— Прадмет даследавання.
— Мэта даследавання.
— Задачы.
— Метады даследавання.
— Навізна і практычная значнасць вынікаў.
— Структура работы.

Аб'ём Уступу звычайна не большы за 5 старонак.

Уступ па тэме даследавання «Канфлікты і характары ў п'есах Андрэя Макаёнка "Зацюканы апостал" і "Пагарэльцы"» можа выглядаць наступным чынам:

У гісторыі беларускай драматургіі творчая спадчына народнага пісьменніка БССР, таленавітага сатырыка-камедыёграфа Андрэя Ягоравіча Макаёнка займае пачэснае месца. З яго імем даследчыкі нацыянальнай драматургіі справядліва звязваюць пачатак новага этапу ў развіцці беларускай сатырычнай камедыі.

Андрэй Ягоравіч Макаёнак — адзін з самых славутых беларускіх драматургаў, дасціпна-гумарыстычныя і з'едліва-сатырычныя п'есы якога ставіліся на сцэнах больш чым 160 тэатраў у былой савецкай краіне. Макаёнкаўскі гумар, які нярэдка падсвечваўся драматычнымі нотамі, набываў і трагікамічны характар, атрымліваў філасофскую заглыбленасць, быў дзейсным сродкам барацьбы пісьменніка з грамадскімі і ўласна чалавечымі заганамі.

Яшчэ ў школьныя гады Андрэй Макаёнак спрабаваў пісаць, але сур'ёзна гэтай справай заняўся, толькі маючы за плячамі ўжо немалы жыццёвы вопыт. Назапашаныя ўражанні і назіранні, роздум над падзеямі, знаёмства з многімі людзьмі абуджалі фантазію, штурхалі да творчасці, узнікала настойлівая патрэба дзяліцца з чытачом сваімі думкамі, разуменнем рэчаіснасці. Развіццю літаратурных здольнасцей Андрэя Макаёнка, шліфоўцы яго прыроджанага таленту сатырыка-камедыёграфа ў значнай ступені садзейнічала праца ў рэдакцыі «Вожыка». Пра гэта яскрава сведчаць фельетоны, гумарэскі, сатырычныя мініяцюры, што змяшчаліся на старонках часопіса і іншых перыядычных выданняў.

Першыя крокі ў творчасці Андрэй Макаёнак зрабіў у другой палове 40-х гадоў XX стагоддзя. Пісьменнік валодаў рэдкім талентам сатырыка-камедыёграфа і баявітым, наступальным характарам, што і абумовіла выключнасць, фенаменальнасць яго асобы. «...Смех — не самамэта, а выхаваўчы сродак, — скажа пазней А. Макаёнак. — Нельга патураць гледачу, які смяецца з пальца, кукіша ці з таго, што персанаж паскроб паясніцу ці стукнуўся галавой аб вушак. Гэта пустасмех. Добрая тая п'еса, пасля прагляду якой хочаш рабіць нешта не так, як раней, хочаш жыць крышачку інакш, не рабіць таго глупства, якое высмеяна са сцэны, публічна» [12, с. 23].

Схільнасць да гумару і сатыры, уменне прыкмячаць смешнае ў жыцці і надаваць яму ўласнае мастацкае асэнсаванне заўважаюцца ўжо ў гумарэсках «Вясёлая прытча» (1949), «Нячыстая сіла» (1949), у фельетонах-пісьмах, што змяшчаліся ў «Вожыку» пад рубрыкай «Выбачайце, калі ласка!» (1950), у фельетонах «Бес ублытаў» (1951), «Карасёва Адысея» (1952) і іншых. У цэнтры ўвагі аўтара — розныя негатыўныя, заганныя з'явы грамадскага жыцця: п'янства, гультайства, бюракратызм, прыпіскі і іншыя махінацыі

несумленных людзей, безадказныя адносіны да дзяржаўных спраў, раскрадванне народнага дабра і інш. Аб’ектам сатырычнага выкрыцця становяцца радавыя абываці і кіруючыя работнікі дзяржаўных устаноў — старшыні калгасаў, райспажыўсаюзаў, загадчыкі аддзелаў райвыканкомаў і нават міністры.

Амаль паралельна з фельетонамі, гумарэскамі, сатырычнымі мініяцюрамі, якія шмат у чым нагадваюць камедыйна-драматычныя эпізоды, выхапленыя з жыцця, Андрэй Макаёнак ствараў і друкаваў на старонках перыядычных выданняў, альманахаў невялікія п’есы, якія ўжо можна было ставіць на сцэне, а неўзабаве, у 1951 годзе, у Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшла кніга аднаактовак драматурга «Перад сустрэчай. Жыццё патрабуе».

Ужо ў ранніх творах пісьменніка выявіліся рысы, якія потым стануць характэрнай асаблівасцю яго манеры: вострае пачуццё сучаснасці, актуальнасць тэматыкі, актыўнае ўмяшанне ў грамадскія працэсы, яснасць ідэйнай пазіцыі і, што не менш важна, схільнасць да камедыйна-сатырычнага паказу рэчаіснасці, уменне спалучаць пафас адмаўлення зла з пафасам сцвярджэння дабра. У аснову аднаактовак, як правіла, клаліся грамадска значныя праблемы і калізіі («Перад сустрэчай» і «Жыццё патрабуе» (1950), «Аксеніна цялушка» (1951), «Першае пытанне» (1952)).

Аднак драматургічнае майстэрства Андрэя Макаёнка расло, мацнела, паступова ў творчасці драматурга акрэслілася надзвычай каштоўная якасць — пошук ва ўсім: у тэматыцы і праблематыцы, у жанры, у адборы жыццёвага матэрыялу і прынцыпах мастацкай тыпізацыі. Пацвярджэнне таму — трагікамедыі «Зацюканы апостал» (1969) і «Трыбунал» (першапачатковая назва «Калабок», 1970). Як і папярэднія камедыі, асабліва «Выбачайце, калі ласка!» і «Лявоніха на арбіце», іх напаткаў шчаслівы сцэнічны лёс: гэтыя п’есы ўбачылі святло рампы не толькі ў тэатрах рэспублікі, але і за яе межамі.

Канец 60-х — 70-я гады былі для пісьменніка вельмі плённымі. У пошуках новых жанравых і структурна-кампазіцыйных форм ён прыйшоў да камедыі-рэпартажу «Таблетку пад язык». У канцы 70-х пачатку 80-х гадоў на сцэне з’явіліся трагікамедыя «Пагарэльцы» і камедыя «Вавёрачка». Яны адкрылі новыя грані драматургічнага таленту Макаёнка: драматург адмовіўся ад традыцыйнай сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора, даў толькі пралог і эпілог. Апошні закончаны твор Андрэя Макаёнка — «Дыхайце эканомна!..». Гэта п’еса-прытча. Пяру Андрэя Макаёнка належаць пераклады многіх п’ес рускіх пісьменнікаў («Трэцяе жаданне» Б. Блажака, «Блакада» У. Іванава, «Чацвёрты» К. Сіманава

і інш.). Па яго сцэнарыях пастаўлены фільмы «У адзінай сям'і» (1957), «Шчасце трэба берагчы» (1958), «Кандрат Крапіва» (1961), «Рагаты бастыён» (1964), «Пасля кірмашу» (1973).

На зарубежную тэматыку А. Макаёнак выйшаў у такіх арыгінальных п'есах, як «Зацюканы апостал» (1969), «Кашмар» (другая назва — «Святая прастата», 1974) і «Дыхайце эканомна!..» (1982). Апошнія два творы маюць вельмі выразную антываенную накіраванасць — пісьменнік з трывогай гаварыў пра пагрозу тэрмаядзернай вайны і згубнасць для грамадства неабмежаванай гонкі ўзбраення, якая патрабавала велізарных матэрыяльных затрат.

Многія даследчыкі беларускай літаратуры надавалі шмат увагі жыццю і творчасці Андрэя Ягоравіча Макаёнка. Сярод іх можна вылучыць такіх крытыкаў як Я. Усікаў з кнігай «Андрэй Макаёнак: Нарыс жыцця і творчасці», С. Лаўшук — «Іменем чалавечнасці». Д. Бугаёў прысвяціў Андрэю Макаёнку адзін са сваіх артыкулаў «Лёс драматурга», які выйшаў у часопісе «Полымя» (1980 год). Сярод твораў мастацкай літаратуры варта адзначыць кнігу І. П. Шамякіна «Аповесць пра сябра».

Мэтай даследавання з'яўляецца вывучэнне адметнасцей канфліктаў і характараў у п'есах «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы» Андрэя Макаёнка.

Акрэсленая мэта рэалізуецца праз дасягненне наступных задач:

1) пазнаёміцца з крытычнай літаратурай па тэме даследавання і творамі А. Макаёнка;

2) вызначыць праблемы і канфлікты, якія раскрывае мастак слова ў сваіх п'есах;

3) ахарактарызаваць сродкі стварэння мастацкіх вобразаў у творах «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы»;

4) вызначыць духоўныя арыенціры герояў у вышэйназваных п'есах;

5) паказаць адрозненне і падабенства канфліктаў і характараў у творах «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы»;

6) вызначыць актуальнасць драматургічнай спадчыны А. Макаёнка для нашага часу.

Прадметам даследавання з'яўляюцца канфлікты і характары, адлюстраваныя ў трагікамедыях.

Аб'ект вывучэння — п'есы знакамітага драматурга «Зацюканы апостал» і «Пагарэльцы».

Даследаванне складаецца з уступу, двух раздзелаў («Канфлікты і характары ў п'есе А. Макаёнка "Зацюканы апостал"», «Спосабы выяўлення драматычнага пачатку ў творы "Пагарэльцы"»), заключэння і спісу літаратуры.

**Асноўная частка** навуковага даследавання складаецца з раздзелаў, у якіх адбываецца:

— аналітычны агляд літаратуры па тэме, разгорнутае абгрунтаванне выбару кірунку даследавання і выкладанне агульнай канцэпцыі работы;

— апісанне аб'екта і прадмета даследавання, выказванне ўласных поглядаў, думак і назіранняў, разважанне над тэмай (праблемай).

У аналітычным аглядзе літаратуры характарызуюцца асноўныя этапы развіцця навуковых поглядаў па праблеме даследавання; можна адзначыць, якія пытанні засталіся па-за ўвагай крытыкаў і літаратуразнаўцаў. У літаратурным аглядзе прыводзяцца ўсе сабраныя даследчыкам літаратурныя дадзеныя, паказваецца ступень вывучанасці закранутай тэмы, даецца кароткая характарыстыка літаратурных крыніц, прысвечаных пэўнай тэме з указаннем ужо вядомага, адлюстраванне «гістарычнага пытання» (хто праблему даследаваў), розных падыходаў да пытання. Неабходна падкрэсліць, якія пытанні ў гэтай тэме не вывучаны.

Пры апісанні ўласнага даследавання выказваюцца назіранні даследчыка, пацверджаныя канкрэтнымі прыкладамі, адзначаецца новае, унесенае ў распрацоўку праблемы. Асноўная частка — гэта сістэма тэзісаў і аргументаў, кожная думка ў ёй аргументуецца, пацвярджаецца прыкладамі з мастацкага тэксту і цытатамі з крытычнай літаратуры. Прычым меркаванні даследчыкаў Вы можаце параўноўваць, згаджацца з імі, а можаце і абвяргаць. Вынікі даследавання неабходна выкладаць сцісла, лагічна, аргументавана і пацвярджаць прыкладамі. Асноўная частка ўяўляе сабой апісанне працэсу даследавання, рашэнне кожнай задачы ў асобным раздзеле (колькі задач, столькі раздзелаў).

Падзел зместу работы на раздзелы, падраздзелы, пункты і падпункты, а таксама іх паслядоўнасць павінны быць лагічна апраўданымі, адпавядаць мэце і задачам даследавання. Кожны раздзел Асноўнай часткі даследавання варта завяршаць кароткімі высновамі, якія падводзяць вынікі канкрэтных этапаў.

Пры напісанні Асноўнай часткі выкарыстоўваюцца наступныя ***віды доказаў***: *лагічны*, заснаваны на рацыянальным

мысленні; *інфармацыйна-спасылачны* — прыводзіцца даведачны матэрыял, статыстычныя дадзеныя, факты, спасылкі на меркаванні аўтарытэтных асоб або арганізацый; *эмацыйны* — слабасць аргументацыі кампенсуецца павышаным пафасам.

У **Заключэнні** коратка выкладаецца сутнасць навуковых вынікаў работы, абагульняюцца літаратурныя дадзеныя і плён уласнага даследавання ў выглядзе заключэння, вывадаў, тэзісаў. Заключэнне ў большасці выпадкаў уяўляе сабой вывады (канкрэтныя, тэзісныя па пунктах), рэкамендацыі па ўкараненню вынікаў у практыку і акрэсліванне перспектывы работы над тэмай.

Колькасць і змест пунктаў заключэння звычайна суадносяцца з задачамі і зместам самой работы.

Заключэнне па тэме даследавання «Канфлікты і характары ў п’есах Андрэя Макаёнка “Зацюканы апостал” і “Пагарэльцы”» можа выглядаць наступным чынам:

У творчасці славутага драматурга Андрэя Ягоравіча Макаёнка адбываліся відавочныя змены: у яго камедыях праяўлялася тэндэнцыя да аналітычнага роздуму, праблемнасці, філасофіі. Гэта вызначала новую лінію ў развіцці беларускай камедыі — тэндэнцыю да інтэлектуалізацыі. Узрастала роля драматургічнай умоўнасці, такіх мастацкіх прыёмаў як гратэск, гіпербала, карыкатура, разгорнутая метафара, сімвал. Драматург імкнуўся да шматзначнасці, большай ступені абагульнення.

У абедзвюх п’есах мы назіраем за жыццём некалькіх пакаленняў: у «Зацюканым апостале» — гэта тры пакаленні (Дзед, Мама з Татам, Сын і Дачка), у «Пагарэльцах» — толькі два (Ухватаў Хведар Паўлавіч з жонкай Раяй і іх дачка). І кожнае з іх яшчэ раз паказвае нам, чытачам і гледачам, што грамадства наша маральна дэградзіруе. Вельмі ярка гэта прасочваецца ў п’есе «Зацюканы апостал». На прыкладзе Таты з Мамай мы бачым, як Сын і Дачка вучацца хлусіць ды так, што і не зразумееш адразу, што гэта хлусня. І самае галоўнае, што бацькі пагаджаюцца з такім становішчам. Нават дзед, які шмат чаго пабачыў на сваім вяку, не хоча паспрыяць таму, каб унук з унучкай змяніліся ў лепшы бок. Яго, як і бацькоў, нічога не хвалюе. Але чаму так? Адказ вельмі просты: яны такія ж самыя, як іхнія дзеці, і яны гэта бачаць, але бацькам сорамна прызнацца ў сваіх заганах.

Тое ж самае адбываецца і з героямі «Пагарэльцаў». Але адрозненне іх у тым, што ніхто нікому, нават сабе, не прызнаецца, што «духоў-

на» яны ўжо мёртвыя. Толькі іхнія антыподы — Наталля Мікалаеўна, Аляксей Аляксеевіч — паказваюць на іхнія заганы ім самім жа.

Драматург яшчэ раз сцвярджае, што галоўную ролю ўсё ж такі адыгрывае не грамадства, а характар асобы: Тата разумее, што жыве няправільна, але нічога не хоча мяняць — ён актыўны прыстасавальнік або проста сапраўдны палахлівец, не адчувае ў сабе хоць трошкі сіл, каб пабароцца з грамадствам за свае погляды; Аляксей Аляксеевіч захацеў стаць архітэктарам, ён ім і стаў. Гэтыя прыклады яшчэ раз пацвярджаюць, што чалавек вельмі залежны ад грамадства, і толькі маральна трывалы чалавек можа вызваліцца ад яго ўлады.

Варта заўважыць, што ўсе пытанні, якія разглядаў у сваіх п'есах Андрэй Макаёнак, актуальны і для нашага сённяшняга жыцця: прысутнічаюць у нас у грамадстве і Тата, і Мама, і Ухватаў з яго кампаніяй. Нездарма казаў філосаф Джанбатыста, што гісторыя рухаецца па крузе.

П'есы Андрэя Ягоравіча Макаёнка — «спапяляючая сатыра на сучаснае буржуазнае грамадства, якое нявечыць асобу, і адначасова страснае сцвярджэнне высокага грамадзянскага прызначэння Чалавека» [12, с. 35].

Сучасныя рэаліі змяшчаюць мноства сюжэтаў, тыпажоў, сітуацый для стварэння паўнавартаснага камедыйнага дзеяння. Існуе значнае кола драматургаў, надзеленых талентам і інтуіцыяй камедыёграфа: Аляксей Дудараў, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Іскрык, Дзмітрый Бойка, Галіна Багданава. І тым не менш глядач сумуе па камедыі, па-сапраўднаму смешнай, па творах, над якімі можна было б проста і нязмушана пасмяяцца, зняць стрэс. Выратоўвае, як і раней, класіка — усё тая ж «Камедыя» К. Марашэўскага, «Паўлінка» Я. Купалы, добрыя старыя вадэвілі «Мікітаў лапаць» М. Чарота, «Чорт і баба» Ф. Аляхновіча, што карыстаюцца нязменнай папулярнасцю ў гледача.

Што адбываецца з камедыяй «пасля Макаёнка»? Куды сыходзіць смех, які павінен валадарыць у камедыяграфіі? Магчыма, ён праяўляецца ў іншых літаратурных жанрах.

**Спіс літаратуры** уключае пералік крыніц інфармацыі, на якія ў рабоце падаюцца спасылкі.

У раздзел **Дадаткі** ўключаецца дапаможны матэрыял (напрыклад, табліцы, ілюстрацыі дапаможнага характару, копіі архіўных дакументаў, тэксты, фотаздымкі, графікі, карты, дыяграмы, анкеты і г. д.).

## Пытанні і заданні

1. З якіх асноўных частак складаецца навукова-даследчая работа? Раскрыйце змест, сутнасць і прызначэнне кожнай з іх.

2. Прааналізуйце прапанаваны настаўнікам або змешчаны ў дапаможніку Уступ; адрэдагуйце і адкарэкціруйце яго.

3. Прааналізуйце змешчанае ў дапаможніку або прапанаванае настаўнікам Заключэнне, адрэдагуйце і адкарэкціруйце яго.

4. Складзіце план Асноўнай часткі даследавання «Канфлікты і характары ў п’есах Андрэя Макаёнка “Зацюканы апостал” і “Пагарэльцы”».

5. Якія дадаткі можна падрыхтаваць да даследавання «Канфлікты і характары ў п’есах Андрэя Макаёнка “Зацюканы апостал” і “Пагарэльцы”»?

6. Напішыце план уласнага даследавання згодна з выбранай Вамі тэмай. Абмяркуйце Ваш план на занятках.

## АФАРМЛЕННЕ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ

Вынікі навукова-даследчых работ розных відаў адлюстроўваюцца ў тэкстах, напісаных навуковым стылем.

**Навуковы стыль** — функцыянальная разнавіднасць маўлення, якая выкарыстоўваецца ў сферы навукі і адукацыі, тэхнікі і вытворчасці. Гэта стыль навуковых артыкулаў, дысертацый, энцыклапедый, слоўнікаў, падручнікаў, навукова-тэхнічнай літаратуры, дакладаў і выступленняў на навуковыя тэмы.

Галоўныя асаблівасці навуковага стылю можна прадставіць у выглядзе наступнай табліцы:

<table>
<tr><th colspan="2">Стыль</th><th>Навуковы</th></tr>
<tr><td colspan="2">Сфера выкарыстання</td><td>Сфера навукі, тэхнікі і навучання (гэта стыль навуковых<br>прац, падручнікаў і лекцый па вучэбных дысцыплінах)</td></tr>
<tr><td colspan="2">Функцыі стылю</td><td>Доказны выклад навуковай інфармацыі; тлумачэнне навуковай інфармацыі; актывізацыя лагічнага мыслення чытача (слухача)</td></tr>
<tr><td>Жанры</td><td>пісьмовая форма</td><td>1. Уласна навуковы падстыль (акадэмічны) — манаграфіі, дысертацыі, навуковыя артыкулы, анатацыі, рэфераты, навуковыя даклады.<br>2. Навукова-папулярны падстыль — навукова-папулярны нарыс, публікацыі ў газетах і часопісах на навуковыя тэмы.</td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| | | 3. Навукова-вучэбны падстыль — падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, даведнікі |
| | **вусная форма** | Публічныя выступленні на навуковых канферэнцыях, сімпозіумах, у аўдыторыях (лекцыі, даклады, навуковыя паведамленні) |
| **Стылёвыя адзнакі** | **на сэнсава-камунікатыўным узроўні** | Вызначальныя рысы — абагульненасць і адцягненасць, строгая лагічнасць і доказнасць; дакладнасць, аб’ектыўнасць |
| | **на лексіка-фразеалагічным узроўні** | Шырокае ўжыванне навуковых і тэхнічных тэрмінаў, адназначных, бязвобразных слоў; аднароднасць лексікі і ўжыванне адных і тых сама слоў; шырокае выкарыстанне абстрактнай лексікі; ужыванне слоў з канкрэтным значэннем для абазначэння агульных паняццяў; рэдкае ўжыванне эмацыянальных слоў і слоў з пераносным значэннем |
| | **на марфалагічным узроўні** | Шырокая ўжывальнасць назоўнікаў; частае нанізванне формаў роднага склону; абазначэнне множнасці праз назоўнік у адзіночным ліку; ужыванне прыметнікаў у састаўных тэрмінах; адсутнасць займенніка *я* і дзеясловаў у форме першай асобы адзіночнага ліку |
| | **на сінтаксічным узроўні** | Ужыванне ўскладненых і складаных сінтаксічных канструкцый (сказаў з аднароднымі членамі, абагульняльнымі словамі, з адасобленымі членамі сказа (дзеепрыметнымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі), з пабочнымі словамі і сказамі); ужыванне прыслоўяў тыпу *спачатку, затым, пасля, потым,* якія вызначаюць паслядоўнасць і лагічнасць выказвання, састаўных злучнікаў (*таму што, у сувязі з тым што, нягледзячы на тое што*); шырокае выкарыстанне спасылак на навуковыя крыніцы і цытат, схем, дыяграм, табліц, графікаў, умоўных абазначэнняў; адсутнасць клічных і пытальных сказаў |

Для паспяховага выканання пісьмовай работы неабходна авалодаць навыкамі культуры пісьмовага маўлення, яго граматычнымі і стылістычнымі нормамі. Асноўнымі якасцямі маўлення з’яўляюцца **выразнасць**, **дакладнасць**, **сціслась**, **багацце**, **лагічнасць**, **чысціня**.

**Выразнасць** лічыцца найважнейшай якасцю выказвання. У большасці выпадкаў выразнасць парушаецца з-за двухсэнсоўнасці, дакладней — з-за няправільнага разумення нейкага элемента або сувязі элементаў.

**Дакладнасць** уяўляе сабой, з аднаго боку, дакладнасць паняційную, а з другога — дакладнасць прадметную, гэта значыць дакладнасць задумы і дакладнасць яе слоўнага ўвасаблення. Іншымі словамі, неабходна аб’ектыўна асэнсаваць з’яву ці паняцце, затым адэкватна аздобіць сваю думку словамі.

**Сціслась** выяўляецца ва ўменні перадаць думку найменшай колькасцю слоў, без таўталогіі, не паўтараць ужо сказанае і не тлумачыць і без таго зразумелае.

**Багацце** адлюстроўваецца ў выкарыстанні сінонімаў і вобразна-выяўленчых сродкаў, бо працэс стварэння пісьмовага тэксту прадугледжвае больш поўны, разгорнуты выраз думкі, чым у гутарковым стылі.

**Лагічнасць** — гэта асноўная ўмова перадачы сэнсавага зместу тэксту, заканамерны ход разважанняў і высноў з аднаго боку і ўнутраная заканамернасць у пабудове тэксту — з другога.

## Тэхнічнае афармленне навуковага даследавання

Навуковае даследаванне друкуецца з выкарыстаннем камп’ютара на адным баку аркуша белай паперы фармату А4 (210x297 мм).

Набор тэксту ажыццяўляецца з дапамогай тэкставага рэдактара Word. Пры гэтым рэкамендуецца выкарыстоўваць шрыфты тыпу Times New Roman памерам 14 пунктаў, міжрадковы інтэрвал — адзінарны або 18 пунктаў, колькасць тэкставых радкоў на старонцы — 39—40. Вызначаюцца наступныя памеры палёў: верхняга і ніжняга — 20 мм, левага — 30 мм, правага — 10 мм. Шрыфт друку павінен

быць прамым, светлага напісання, выразным, чорнага колеру, аднолькавым па ўсім аб'ёме тэксту работы. Дазваляецца выкарыстоўваць камп'ютарныя магчымасці акцэнтавання ўвагі на азначэннях, тэрмінах, важных асаблівасцях, ужываючы курсіўнае, паўтлустае, курсіўнае паўтлустае вылучэнне, а таксама з дапамогай рамак, разрадкі, падкрэслівання і інш.

Аб'ём даследавання, як правіла, не павінен быць меншым за 10 старонак — для рэферата, за 15 старонак — для даклада (без уліку Спісу літаратуры і Дадаткаў).

Тэкст Асноўнай часткі навукова-даследчай работы падзяляюць на раздзелы, падраздзелы, пункты і падпункты.

Загалоўкі структурных частак Змест, Уводзіны, Раздзел, Заключэнне, Спіс літаратуры, Дадаткі друкуюць вялікімі літарамі ў сярэдзіне радкоў, выкарыстоўваючы паўтлусты шрыфт, памер якога на 1—2 пункты большы за шрыфт у асноўным тэксце. Аналагічна друкуюцца загалоўкі раздзелаў. Загалоўкі падраздзелаў друкуюцца малымі літарамі (акрамя першай) з абзацнага водступу паўтлустым шрыфтам памерам на 1—2 пункты большым за асноўны тэкст. Пункты, як правіла, загалоўкаў не маюць. Пры неабходнасці загаловак пункта друкуецца з абзацнага водступу паўтлустым шрыфтам памерам шрыфта асноўнага тэксту ў падбор да тэксту.

У канцы загалоўкаў раздзелаў, падраздзелаў і пунктаў кропка не ставіцца. Калі загаловак складаецца з двух або больш сказаў, паміж імі ставіцца кропка.

Кожную структурную частку даследавання варта пачынаць з новай старонкі.

Нумарацыя старонак даецца арабскімі лічбамі. Першай старонкай з'яўляецца тытульны ліст, які ўключаюць у агульную нумарацыю старонак. На тытульным лісце нумар старонкі не ставяць, на наступных лістах нумар прастаўляюць у цэнтры ніжняй часткі ліста без кропкі ў канцы.

Нумарацыя раздзелаў, падраздзелаў, пунктаў і падпунктаў, малюнкаў, табліц падаецца арабскімі лічбамі без знака «№». Падраздзелы нумаруюцца ў межах кожнага раздзела. Нумар падраздзела складаецца з нумара раздзела і парадкавага нумара падраздзела, падзеленых кропкай, напрыклад:

«2.3» (трэці падраздзел другога раздзела). Аналагічна нумаруюцца пункты і падпункты.

У канцы нумарацыі, а таксама іх загалоўкаў кропку не ставяць.

Лічбавы матэрыял афармляецца ў выглядзе табліцы. Кожная табліца павінна мець кароткі загаловак, які складаецца са слова «Табліца», яе парадкавага нумара і назвы, аддзеленай ад нумара працяжнікам (*Табліца 3.17 — Віды метафар).* Загаловак варта змяшчаць над табліцай злева, без абзацнага водступу.

Як ужо не раз адзначалася, аўтар даследчай работы абавязаны спасылацца на крыніцы і матэрыялы, асобныя вынікі якіх выкарыстоўваюцца ў яго даследаванні. Калі адзін і той жа матэрыял неаднаразова перавыдадзены, то варта спасылацца на яго апошняе выданне. Нагадаем, што спасылкі на крыніцы ў тэксце ажыццяўляюцца шляхам прывядзення нумара ў адпаведнасці са Спісам літаратуры. Нумар крыніцы па спісе заключаецца ў квадратныя дужкі. Напрыклад: [14, с. 26] (тут: 14 — нумар крыніцы ў Спісе літаратуры, 26 — нумар старонкі).

Звесткі пра выкарыстаныя крыніцы прыводзяцца ў раздзеле Спіс літаратуры ў алфавітным парадку прозвішчаў першых аўтараў і (або) загалоўкаў паводле «Узору афармлення бібліяграфіі» (прыводзім табліцу крыху ніжэй). Звесткі пра крыніцы друкуюцца з абзацнага водступу, пасля нумара кропка не ставіцца.

Дадатак павінен мець загаловак, які друкуецца з новага радка па цэнтры старонкі з вялікай літары. Дадаткі пазначаюць загалоўнымі літарамі беларускага алфавіту, пачынаючы з А. Напрыклад: «ДАДАТАК А», «ДАДАТАК Б».

*Тытульная старонка (узор)*

**Установа адукацыі «Гімназія № 10 г. Мінска»**

**Прозвішча**

**Імя, імя па бацьку**

**Клас**

**НАЗВА РАБОТЫ**

**Даклад (рэферат) па беларускай літаратуры**

**Навуковы кіраўнік —**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
**Іванова А. І.**

**Мінск, 2010**

## Узор афармлення рэферата

<table><tr><td>

**Назва агульнаадукацыйнай установы**

**Назва рэферата**

**Выканаў(ла)**<br>**Прозвішча, імя, імя па бацьку**<br>**вучань(іца)____класа**

**Месца знаходжання агульнаадукацыйнай установы, год напісання рэферата**

</td></tr></table>

## Узоры афармлення бібліяграфічнага спісу

### 1. Афармленне адной крыніцы

| Характарыстыка крыніцы | Узор афармлення |
|---|---|
| Адзін, два, тры аўтары | Бельскі, А. І. Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2000. — 126 с. |
| | Мішчанчук, М. І. Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. — Мінск : Выш. шк., 2001. — 352 с. |
| Чатыры і больш аўтараў | Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку / С. А. Андраюк [і інш.]; навук. рэд. В. М. Стральцова. — Мінск : Беларуская навука, 2008. — 283 с. |
| Калектыўны аўтар | Беларускія пісьменнікі на старонках часопіса «Роднае слова»: бібліягр. паказ. / Бел. асац. «Конкурс» ; склад. А. В. Высоцкая [і інш.]. — Мінск : Бел. Асац. «Конкурс», 2008. — 256 с. |
| Шматтомнае выданне | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддзяленне гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. ім. Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск : Бел. навука, 1999—2003. — Т. 2 : 1921—1941. — Мінск : Бел. навука, 1999. — 903 с.; Т. 3 : 1941—1965. — Мінск: Бел. навука, 2001. — 952 с. |
| Асобны том у шматтомным выданні | Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддзяленне гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. ім. Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск : Бел. навука, 1999. — Т. 2 : 1921—1941. — 903 с. |
| | Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. — 2-е выд. — Мінск : Бел. навука, 2001. — Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. — 751 с. |